Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ЧЭРВЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 109 (26222)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Беларусь і Расія разам упішуць нямала яркіх старонак у гісторыю сучаснасці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і ўсіх расіян з Днём Расіі.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што саюзныя беларуска-расійскія адносіны будуць паспяхова развівацца на карысць цяперашняга і будучага пакаленняў, садзейнічаючы ўстойліваму развіццю дзвюх дзяржаў, павышэнню іх міжнароднага аўтарытэту, і дзве дружалюбныя дзяржавы разам упішуць нямала яркіх старонак у гісторыю сучаснасці.

## Прэзідэнт Беларусі станоўча ацэньвае работу супрацоўнікаў КДБ

«Даходзяць чуткі, што Прэзідэнт, быццам бы, вельмі незадаволены работай КДБ. Усё гэта чуткі. Я заўсёды паважаў гэту арганізацыю і лічу, што там працуюць самыя чыстыя і сумленныя людзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды афіцэрам КДБ. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў узнагароджаным за іх тытанічную працу, звязаную з вялікай фізічнай нагрузкай. Прэзідэнт таксама дадаў, што ў гэтай арганізацыі павінны служыць толькі сумленныя і прыстойныя людзі.

## Некаторыя камерцыйныя арганізацыі вызваляюцца аб захавання гранічных індэксаў змянення адпускных цэнаў

У мэтах прыцягнення ўнутраных інвестыцый у Беларусі вызваляюцца ад захавання гранічных індэксаў змянення адпускных цэнаў (тарыфаў) камерцыйныя арганізацыі, у тым ліку з замежнымі інвестыцыямі, створаныя з 1 красавіка 2008 года ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 50 тыс. чалавек. Гэта прадугледжана ўказам Прэзідэнта Беларусі № 322 ад 12 чэрвеня «Аб унясенні дапаўнення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 мая 1999 г. № 285».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Трактар «Беларус» ад імя Аляксандра Лукашэнкі перададзены былому віцэ-прэзідэнту Індыі

Трактар «Беларус» ад імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі перададзены былому віцэ-прэзідэнту Індыі і старшыні верхняй палаты індыйскага парламента Бхайрану Сінгху Шэкхавату. Як паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, гэта знак удзячнасці за ўклад Бхайрана Сінгха Шэкхавата ў развіццё беларуска-індыйскіх адносінаў. Цырымонія перадачы трактара адбылася ў г. Нью-Дэлі. Беларуска-індыйскі дыялог мае пазітыўную дынаміку, і вяртанне беларускай трактарнай тэхнікі на індыйскі рынак уяўляецца перспектыўным, падкрэслілі ў МЗС.

**БЕЛТА.**

## Пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі ў Беларусі Найджэл Гулд-Дэвіс: «Я асабіста вельмі люблю беларускія цукеркі і пастаянна іх ем»

**Брытанскі бізнэс праяўляе значную цікавасць да магчымасцяў работы ў Беларусі, заявіў кіраўнік місіі Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі ў Беларусі Найджэл Гулд-Дэвіс.**

«Брытанскі бізнэс гатовы інвеставаць у любыя галіны беларускай эканомікі, дзе ёсць стабільнасць, прадказальнасць, празрыстасць і тонкае, паслядоўнае рэгуляванне», — сказаў пасол. Ён адзначыў зробленыя ў Беларусі апошнім часам захады па лібералізацыі эканомікі, у прыватнасці, адмену інстытута залатой акцыі. «Калі працэс лібералізацыі прадоўжыцца, то можна чакаць павышанага інтарэсу з боку брытанскіх кампаній», — лічыць кіраўнік дыпмісіі. «Каньком», паводле яго меркавання, з'яўляецца фінансавая дзейнасць. Пасол станоўча адазваўся аб планах правесці ў лістападзе гэтага года ў Лондане беларускі інвестыцыйны форум. Гаворачы аб галінах эканомікі, у якіх найбольш верагоднае развіццё беларуска-брытанскага супрацоўніцтва, Найджэл Гулд-Дэвіс падкрэсліў, што цяпер большую частку экспарту з Беларусі ў Вялікабрытанію складаюць нафтапрадукты. Пры гэтым ён адзначыў якасную прадукцыю шклозавода «Нёман», а таксама заявіў, што ў Брытаніі ёсць цікавасць да беларускай мэблі. «Я асабіста вельмі люблю беларускія цукеркі і пастаянна іх ем», — сказаў пасол. Найджэл Гулд-Дэвіс запэўніў, што сусветны вопыт лонданскіх дзелавых колаў адкрыты для беларускіх кампаній, якія шукаюць доступ да фінансавых паслуг.

**Аляксей БУКЧЫН, БЕЛТА.**

Як нас дураць

## З ЕВАЙ У ІЕРУСАЛІМ...

### Прайдзісветка збірае грошы на псеўдапаломніцкія туры

**У рэспубліцы пацярпелі ўжо некалькі прасцякоў, якія паддаліся на ўгаворы невядомай махляркі наведаць Іерусалім, і добраахвотна «спансіравалі» яе сваімі грашыма.**

На сёння праваахоўнікам дакладна вядомыя тры факты махлярства, учыненага невядомай, паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення крымінальнага вышуку Галоўнага ўпраўлення крымінальнай міліцыі МУС Уладлена Харытонава. Прычым усе яны зарэгістраваныя на чыгуначных вакзалах — Брэста і Оршы. Пад «чары» жанчыны трапілі асобы праваслаўнага веравызнання, увагу якіх яна прыцягвала сваёй рэлігійнай адукаванасцю, веданнем царкоўных правілаў і інфармаванасцю. У прыватнасці, сваіх ахвяраў яна загаворвала, распавядаючы ім пра цэрквы, што дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі, пра храмы і манастыры... Калі ж «кліенты» пачыналі «выспяваць», падыходзіла да галоўнага: маўляў, яна атрымала ў Іерусаліме блаславенне ад старца на збор паломнікаў для наступнага афармлення ім дакументаў і арганізацыі паездак на Святую зямлю. Тут бы людзям і ачомацца, аднак... Настойлівая суразмоўца, якая, дарэчы, прадстаўлялася Евай, гнула сваё далей: быццам бы працуе гідам Мінскай епархіі. А таму можа заказаць малебен абразу Божай Маці ў Іерусаліме і ажыццяўляць выезды туды з групамі хворых дзетак. Старанні махляркі не былі марнымі. Прынамсі, сведчанне гэтаму — тыя пацярпелыя, якія ўручылі ёй грошы на афармленне візы, плату за праезд і пражыванне ў Іерусаліме. Зразумела, што пасля «гід» знікаў у невядомым напрамку. Пакрыўджаныя людзі, між тым, добра запомнілі дабрадзейку. Паводле іх слоў, на выгляд жанчыне 50—55 гадоў, яна мае моцны целасклад, рост каля 165 сантыметраў і сярэдняй даўжыні фарбаваныя з рыжаватым адценнем валасы. Ёсць у яе і асаблівая прымета — на правай руцэ адсутнічаюць пальцы — мезенец і безыменны.

**Ігар ГРЫШЫН.**




Гродзенскі юнак Максім НОВІКАЎ — навучэнец Рэспубліканскай школы алімпійскага рэзерву, 5-разовы чэмпіён Беларусі на 1000 метраў на байдарцы і каноэ. Яго любімае месца трэніровак — возера ў вёсцы Азёры Гродзенскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фестывалім

## БЕРАГЧЫ КАРАНІ І ПАВАЖАЦЬ КУЛЬТУРУ СУСЕДЗЯЎ

**У 7-ы раз сёлета ў Гродне распачынаецца заключны этап Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які стаў ужо своеасаблівай візітоўкай рэгіёна. З 13 па 15 чэрвеня ў горадзе над Нёманам прэзентуюць свае творчыя набыткі і культурныя традыцыі прадстаўнікі 27 нацыянальнасцяў. Усяго ж у Беларусі, паводле даных перапісу 1999 года, у міры і згодзе жывуць прадстаўнікі каля 140 нацыянальнасцяў.**



Гродзенскую «прапіску» фестываль атрымаў невыпадкова. «Менавіта на Гродзеншчыне, самай невялікай па тэрыторыі вобласці Беларусі, пражывае найбольшая колькасць нацыянальнасцяў — 87, — адзначае **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя БІРУКОВА.** — Адны пасяліліся на гэтай зямлі шмат стагоддзяў таму, іншыя прыехалі ў апошнія гады, але для ўсіх іх наша краіна стала другой радзімай».

Афіцыйная статыстыка сведчыць: у вобласці на сёння дзейнічаюць 22 грамадскія аб'яднанні 11 нацыянальных суполак, у тым ліку 4 польскія, 6 літоўскіх, 4 яўрэйскія, украінскае, рускае, аб'яднанне татараў, грузінаў, чувашаў, цыганоў і армян, азербайджанцаў. «Важнасць дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў заключаецца ў тым, што яны развіваюць свае нацыянальна-культурныя традыцыі, зберагаюць літаратуру, святочныя і абрадавыя комплексы, даносяць сваю культуру да шырокай грамадскасці ў нашай краіне, адначасова ўзбагачаючы і беларускую культуру», — падкрэслівае Марыя Міхайлаўна.

Фестываль, заснаваны Міністэрствам культуры Беларусі, Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Беларусі, Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур, Гродзенскім абласным і гарадскім выканаўчым камітэтам, традыцыйна праходзіць раз на 2 гады і сімвалізуе міжнацыянальную дружбу і суладдзе на беларускай зямлі.

***— Сам фестываль — гэта толькі вяршыня айсберга, заключная частка конкурсу-агляду, які журы праводзіла ў розных рэгіёнах. Дзе праходзілі сёлета папярэднія адборачныя туры, прадстаўнікі якіх абшчын узялі ўдзел у конкурсе ўпершыню?***

— Этнаграфічнай асаблівасцю гэтага фестывалю з'яўляецца яго паэтапная падрыхтоўка: кожны раз яго арганізоўваюць і праводзяць на працягу двух гадоў спачатку ў раёнах, затым у абласцях рэспублікі і, нарэшце, заключныя мерапрыемствы праходзяць у сталіцы свята — Гродне.

З верасня 2007 года па студзень 2008 года прайшлі адборачныя абласныя і Мінскі гарадскі туры фестывалю ў Міёрах (Віцебская вобласць), Жабінцы (Брэсцкая), Жлобіне (Гомельская), Гродне, Сеніцы (Мінская), Мінску і Магілёве. Першае на постсавецкай прасторы свята нацыянальных культур, нарадзіўшыся ў Беларусі, вось ужо сёмы раз крочыць па беларускай зямлі, з кожным годам знаходзячы новых сяброў. І калі ў першым фестывалі ўзялі ўдзел прадстаўнікі адзінаццаці нацыянальных аб'яднанняў, то ў цяперашнім, сёмым — ужо 53, больш за дзве тысячы чалавек.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям VII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур з нагоды яго адкрыцця.*

*«У Беларусі складваліся шматвяковыя традыцыі добрасуседства, узаемнай дапамогі і павагі паміж прадстаўнікамі розных народаў, якія ўзбагачаюць нашу духоўную скарбніцу каштоўнасцямі мастацкай спадчыны і сучаснымі творчымі дасягненнямі», — гаворыцца ў пасланні. Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння дзяржава стварае самыя спрыяльныя ўмовы для захавання іх культурнай разнастайнасці і звычаяў. Яркім прыкладам паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца гэты фестываль, які дэманструе лепшыя дасягненні самабытных культур, садзейнічае ўмацаванню міру і ўзаемнай павагі ў нашым агульным доме, лічыць Кіраўнік дзяржавы. «Няхай ваша акцыя з года ў год набірае сілу, сцвярджае невычэрпнасць таленту і творчай энергіі беларускага народа, пашырае кола сваіх прыхільнікаў і сяброў», — пажадаў Прэзідэнт.*

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### МЕДАЛЬ ДА 65-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ



**На пасяджэнні Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, які адбыўся днямі, быў разгледжаны праект юбілейнага медаля «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».**

Згодна з апісаннем узнагароды, на вонкавым баку медаля на фоне Цэнтральнага ўвахода ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» адлюстраваны Курган Славы. Пад абодвума промнямі зоркі Цэнтральнага ўваходу размешчаны даты «1944» і «2009». У ніжняй частцы медаля дадзена рэльефнае адлюстраванне ордэна Айчыннай вайны. На адваротным баку медаля надпіс «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Лічба «65» у абрамленні стужкі ордэна Славы, на згібах якой размешчаны даты «1944» і «2009». У ніжняй частцы размешчана рэльефная пяцікутная зорка. Па акружнасці медаль аблямоўвае борцік. Медаль вырабляецца з тампака з пакрыццём серабрыстага колеру. Памер медаля — 32 мм у дыяметры. Медаль мацуецца да адзення пры дапамозе пяцікутнай калодкі, абцягнутай шаўковай муаравай стужкай. Стужка састаўная, утрымлівае колеры Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і стужкі ордэна Славы. Членамі Геральдычнага савета былі выказаны заўвагі адносна калодкі медаля: колеры стужкі, верагодна, застануцца ранейшымі, а іх размяшчэнне, магчыма, крыху зменіцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### НА ВЫХАДНЫЯ — ДАЖДЖЫ

**Ужо сёння паўднёвы ўсход краіны трапіць пад уплыў актыўнага атмасфернага фронту, дзе ўдзень будуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. Тэмпература ўдзень 18—24.**

У суботу зона дажджоў ахопіць амаль усю тэрыторыю краіны, а па ўсходзе яны чакаюцца даволі моцныя. Удзень пры навальніцах узмацненне ветру да 15—18 м/с. Тэмпература ўначы 9—15, па паўднёвым усходзе да 17 градусаў, удзень 15—22, па ўсходзе да 25 градусаў. У нядзелю кароткачасовыя дажджы захаваюцца толькі па ўсходзе краіны. Тэмпература ўначы 7—14, удзень 18—24 градусы. У панядзелак дажджы будуць месцамі, а ў аўторак па паўночным захадзе дажджы і навальніцы. Тэмпература ўначы 8—14, удзень у панядзелак 18—24, у аўторак ужо на 2—3 градусы вышэйшая. Кароткачасовыя дажджы будуць бадай увесь наступны тыдзень.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### РАБАЎНІКІ ЗАВАЛОДАЛІ ЎПРЫГАЖЭННЯМІ З БРЫЛЬЯНТАМІ

**Каля а паловы чацвёртай ночы пяцёра рабаўнікоў у шапачках з проразямі для вачэй уварваліся ў прыватны дом па вуліцы Верасковай у Мінску.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 37-гадовы гаспадар, да якога ў дом зламыснікі праніклі, узламаўшы акно, не змог аказаць супраціўлення нахабнікам. Тым больш, што ў руках злачынцаў знаходзіліся прадметы, падобныя на пісталеты. Звязаўшы мужчыну і яго 34-гадовую жонку, рабаўнікі пад пагрозай зброі завалодалі 4 залатымі і 2 плацінавымі ювелірнымі вырабамі з брыльянтамі. Акрамя ўпрыгажэнняў, яны забралі 1100 долараў ЗША, 560 тысяч рублёў, 5 наручных гадзіннікаў і 2 сотавікі. Група затрымання, што прыбыла на месца здарэння пасля таго, як пацярпелыя дабраліся да трывожнай кнопкі, злачынцаў ужо не заспела. Вядзецца пошук рабаўнікоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### БРАЎ, БРАЎ — УЗЯЛІ І ЯГО

Гаворка пра дырэктара пінскага рынку. Цяпер ужо былога. На сваёй пасадзе гэты чалавек рэгулярна браў хабар з прадпрымальнікаў за гандлёвае месца. Следствам даказаныя, як мінімум, 11 эпізодаў хабарніцтва. Памеры асобных «выплат» даходзілі да пяці тысяч долараў. Суд Пінскага раёна прыгаварыў былую службовую асобу да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

**Яна СВЕТАВА.**

### МАЦІ І НЕМАЎЛЯ ТРАПІЛІ Ў ДТЗ

У Рагачове каля шасці вечара вадзіцель МАЗа ўчыніў наезд на маладую маці з дзіцячай каляскай. Здарэнне адбылося на нерэгулюемым пешаходным пераходзе: жанчына, якая знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці, пераходзіла дарогу. У калясцы, якую яна каціла, знаходзіўся яе сын. У выніку наезду жанчына атрымала цялесныя пашкоджані і была змешчана ў бальніцу. А вось немаўля загінула на месцы дарожна-транспартнага здарэння.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### МАЗ НАЕХАЎ НА МАРШРУТКУ

12 чэрвеня раніцай у Магілёве сутыкнуліся аўтамабіль МАЗ і маршрутнае таксі. Пацярпела жанчына, у якой вывернута і зламана левая рука. Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося на перакрыжаванні вуліцы Якубоўскага і завулка Загараднага. МАЗ, які выязджаў з завулка на галоўную дарогу, не прапусціў маршрутку. Віна вадзіцеля МАЗа была відавочная, і ён яе прызнаў.

**Алена КАЗЛОВА.**

Рэпартаж з колаў

## ЛЮБІ СВАЁ...

**Вуліц імя 17 Верасня ў беларускіх гарадах і гарадках шмат (хоць безумоўна ж, менш, чым Камуністычных, Сацыялістычных, Кастрычніцкіх... Не кажучы ўжо пра Леніна...), але ў Мядзелі яна адметная. Не чысцінёй, не кветкамі, не роўным асфальтам (гэтым цяпер, калі здзівіш, то толькі прыезджых), — на ўездзе на фасадах дамоў — два вялізарныя каляровыя плакаты. Глядзеў бы і глядзеў, як кажуць, бо на абодвух (здымкі, відаць, з верталёта?) нашы прыўкрасныя (Караткевіч любіў гэта слова) сіне-блакітныя азёры ў акружэнні зялёных лясоў...**




Кацярына Андрэеўна ПЯТРОВА.

Знізу — як водзіцца — заклікі. Пад адным — «Сберечь родную природу для потомков — наша задача». Пад другім — «Каждый в ответе за природное достояние страны».

Словы, як быццам, правільныя, дарэчныя? Хоць (як мне, прынамсі, здалося) тут лепш «спрацоўвалі» б іншыя... Два... Вельмі простыя: «Любі сваё...».

Зрэшты, не варта забягаць наперад: на пачатку чарговага звяздоўскага турнэ было Маладзечна. Не таму, што яно бліжэй, не таму, што па дарозе. Тлумачэнняў гэтай з'яве няма, і, відаць, быць не можа, але гэты горад, гэты раён вельмі любяць звяздоўскія прызы. Гады тры-чатыры таму да адной з падпісчыц трапіў двухкамерны халадзільнік, потым — першы тэлевізар, другі, мікрахвалевая печ...

Не з пустымі рукамі, з «Віцязем», ехалі мы і ў гэты раз. Ведалі, што сустрэнем ужо знаёмых і такіх прыязных паштавікоў, супрацоўнікаў ідэалагічнага аддзела райвыканкама, ведалі, што прыз павінны ўручыць (бо выйграла ж!) Кацярыне Андрэеўне Пятровай...

Што, відаць, заканамерна, яна ўжо чакала нас. Што здзівіла крыху — ніколькі не разгубілася ад накіраванай на яе тэлекамеры, ад мікрафонаў журналістаў (сустрэчу гэту здымалі калегі з Маладзечанскага тэлебачання), гаварыла, як запраўская дыктарка, упэўнена, смела, што газету выпісвае гадоў з 30 ужо, што паважае ўсіх карэспандэнтаў за працу, што дзякуючы ёй, гэтай працы, ведае, дзе што робіцца ў краі (прычым чытае пра ўсё — на роднай мове), што ўдзячна за розыгрыш прызоў, бо ніколі ў жыцці не выйгравала больш, чым тры рублі, а тут на табе!

— Прачытала ў газеце, што выйграла тэлевізар, — расказвала Кацярына Андрэеўна, — дай, думаю, дачцэ пазваню. Нумар набрала, хвалюся. Яна слухае, але ж не верыць. Кажа: «Мама, ну не можа быць! Табе ж ніколі не шанцавала!». Я ёй тады: «Гэта мне ўперад не шанцавала, а вось цяпер...».

Калі за нашым, звяздоўскім, да Кацярыны Андрэеўны цугам пойдуць нейкія іншыя прызы, мы, зразумела ж, толькі ўзрадуемся, бо чалавек гэты — заслугоўвае: штамп і стары, але ж словы «жыццё, аддадзенае дзецям» — гэта пра яе, бо вырасціла і годна выхавала сваіх, дваіх — сына і дачку (цяпер у яе ўжо трое праўнукаў), як магла, ратавала чужых...

Да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС сям'я Кацярыны Андрэеўны жыла ў Нароўлі, сама яна — працавала загадчыцай у дзіцячым садку. Адразу ж па майскіх святах, расказвала, у райкам паклікалі. Задачу паставілі: трэба, маўляў, каб уся дзятва вярнулася ў групы, у класы...

— Людзі, калегі мае, галовы паапускалі, маўчаць, — успамінае Кацярына Андрэеўна. — А я чалавек прамы. Пытаюся: «А дзе цяпер вашы дзеці?» Мне адказваюць: муж, маўляў, забраў і завёз... Не помню цяпер, куды... «Дык вось, — кажу, — і кожны так... Кожны — сваё дзіця ратуе». Яна адразу: «Вы получите взыскание... По партийной линии». А па мне дык і хай. Абы дзеці здаровыя. Так і выдала... Дырэктар першай школы мяне падтрымаў. Усё заціхла. 6 мая толькі, вечарам, на педсавет сабралі, сказалі, што заўтра раніцай дзяцей з горада, з раёна вывозіць будуць. Трэба тэрмінова папярэдзіць бацькоў...

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

### ПАЦЯРПЕЛА ДЗІЦЯ

У Баранавіцкім парку ў люк праваліася пяцігадовая дзяўчынка. Бацькі сядзелі ў летнім кафэ, а дзеці гулялі непадалёк. Малая наступіла на фанерку, якой быў прыкрыты каналізацыйны калодзеж, і правалілася на двухметровую глыбіню. Дзяўчынка шпіталізавана, гарадскі аддзел унутраных спраў праводзіць праверку.

**Яна СВЕТАВА.**

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.06.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 131,00 |
| 1 еўра | 3 288,45 |
| 1 латвійскі лат | 4 794,69 |
| 1 літоўскі літ | 973,79 |
| 1 чэшская крона | 136,76 |
| 1 польскі злоты | 971,17 |
| 1 расійскі рубель | 89,93 |
| 1 украінская грыўня | 450,53 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,6109 |
| 10 UAH | 49,2325 |
| 1000 BYR | 11,0739 |
| EUR | 36,8070 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 12.06.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08109>

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»**

**СООБЩАЕТ, ЧТО 24 ИЮНЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

*220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Положения о Наблюдательном совете ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 11 июня 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения и расчетно-кассовые центры по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 20 июня 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 3 июля 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.**

**КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА**

Тел.: короткий номер 136 (звонок бесплатный на территории РБ), (017) 218 57 77, 8 029 1 985 777 (Velcom), 8 025 9 185 777 (БеСТ), 8 029 8 885 777 (МТС).

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.*

**ОАО «Гродненская табачная фабрика»**

**ПРИГЛАШАЕТ ВСЕХ**

**заинтересованных лиц принять участие в разработке дизайна макета пачки для сигарет формата «Super slims».**

*За дополнительной информацией обращаться по тел.: **0152 52 20 77, 52 20 76, 51 11 50.***

*e-mail: info@tabak.by, marketing@tabak.by.*

*Срок подачи заявок — до 15.07.2008 г.*

УНП 500047627

Приорбанк
Открытое акционерное общество

RZB Group

**Уважаемые акционеры «Приорбанк» ОАО!**

«Приорбанк» ОАО извещает, что 04.06.2008 г. Уставный фонд банка был увеличен до 270 105 160 100 белорусских рублей путем увеличения номинальной стоимости одной акции «Приорбанк» ОАО до 3350 белорусских рублей за счет источников собственных средств банка. При этом процентная доля участия в Уставном фонде банка не изменилась ни у одного акционера.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 12 от 26.04.07г. УНП 100220190*

**БПС-БАНК**

С 17 июня 2008 года ОАО «БПС-Банк» для размещения денежных средств предлагает физическим лицам новый вид срочного банковского депозита в белорусских рублях «Партнерство» на следующих условиях:

| | |
|---|---|
| Процентная ставка | 13,5 % |
| Срок хранения вклада | 2 года |
| Сумма первоначального взноса | 500 тысяч белорусских рублей |
| Дополнительные взносы | • без ограничений суммы и периодичности внесения |
| Частичное снятие | • допускается до размера 2,5 млн. руб. без уменьшения процентной ставки |
| Порядок начисления и выплаты процентов | • ежемесячная капитализация<br>• выплата за любое количество периодов начисления |
| Досрочное расторжение | • до 1 мес. – ставка текущих счетов физических лиц<br>• свыше 1 мес. до 6 мес. – 50 % ставки по депозиту<br>• свыше 6 мес. – установленная по депозиту ставка |
| Иные условия | • с правом заключения договора на имя другого лица |

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 4 от 11.07.2007. УНП 100219673*

## Нататкі звычайнага грамадзяніна

# Чаму бізнэсмены не зарабляюць?

### альбо Парады спажыўца прадпрымальнікам

**Вось прыклад. Стары прынтар. Заправіць катрыджы ў ім — праблема. Вядома ж, навошта вазіцца з рарытэтным абсталяваннем, калі ў пераважнай большасці — параўнальна новыя прынтары? А калі ёсць асобныя выпадкі? Куды звяртацца? «Лепш купіце новы!» — раяць тыя, хто не можа выправіць прынтарную праблему.**

А адрамантаваць камп'ютарны стол? «Не», — адказваюць усе, каму па гэтай праблеме патэлефанавалі. — Вось зрабіць... Зможам, з задавальненнем, а рамантаваць? Не, гэтым не займаемся».

Пра што гаварыць, калі звычайны камп'ютар у Віцебску, аказваецца, вядомыя мясцовыя фірмы прадаюць «не ўсім». «Толькі па безнаяўным разліку», — адказвае чарговы менеджар. Пытанне, а чаму пры ўваходзе ў будынак, дзе вы здымаеце памяшканне, ёсць стэнд з аб'явай «Прадаём камп'ютары» не гаворыцца пра тое, што не рэалізуеце прыватным асобам? — застаецца без адказу.

А ў іншай фірме адразу менеджар пацікавілася: «Калі будзеце купляць камп'ютар, дзе будзеце афармляць крэдыт? Вось — прадстаўнік банка, з якім мы супрацоўнічаем. На месцы крэдыт аформім». Размова скончылася адмовай у прадстаўленні так званых прайсаў. Маўляў, пры ўваходзе ёсць усе паперы. Вось і шукай патрэбныя менавіта табе прайсы сярод такіх папер усіх тавараў. А іх сотні.

Думаецца, што па законах канкурэнцыі менавіта на пералічаных «дробязях» і не толькі на іх многія дзелавыя людзі маглі б перыядычна атрымліваць прыбытак. Мо і нядрэнны, каб добра рэкламавалі свае эксклюзіўныя паслугі. Няўжо не разумеюць, што ўмова «безнаяўны разлік» адбівае патэнцыйных прыватных кліентаў. Безумоўна, праз знаёмых прадпрымальнікаў можна аформіць любую безнаяўную здзелку. Але хто з большасці простых грамадзян будзе траціць час на ўсё гэта?

Пра работу фірмаў, што аказваюць паслугі па вырабе мэблі, можна напісаць серыю артыкулаў. Нядаўна звычайны грамадзянін быў вельмі здзіўлены, калі прывезлі яму стол для камп'ютара поўнасцю сабраным. Не праходзіў праз дзверы. «Будзем здымаць дзверы», — заявілі прадстаўнікі фірмы-вытворцы. І пачалі шкодзіць уваход у кватэру. Ці закажа ў іх кліент яшчэ нешта? Не ўпэўнены!

Перыядычна даводзіцца чуць скаргі прадпрымальнікаў на цяжкія ўмовы пры ажыццяўленні бізнэс-дзейнасці. Ой, падаткі вялікія, шмат праверак і інш. І, бывае, хочацца пагадзіцца. Але. Улічваючы вышэй пералічаныя прыклады, становіцца незразумелай сутнасць такіх скаргаў. Так, умовы для бізнэсу ў нас яшчэ «не райскія», але намаганні для іх паляпшэння з боку дзяржавы робяцца. А з боку прадпрымальнікаў... грамадзяне чакаюць пашырэння паслуг і якасці іх ажыццяўлення. Асабліва ў правінцыі, у сельскай мясцовасці, дзе менавіта «эксклюзіўныя паслугі» вельмі запатрабаваныя. Не за «дзякуй» жа. За грошы. І не хочацца тут прадпрымальнікам зарабіць? Не верыцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЕРАГЧЫ КАРАНІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кандыдатамі для ўдзелу ў заключных мерапрыемствах у Гродне рэспубліканскае журы адабрала больш як 700 прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. Адметна і тое, што падчас правядзення адборачных тураў з'явіліся новыя нацыянальнасці — балгары, кабардзіна-балкарцы, арабы. Хочацца адзначыць творчую разнастайнасць канкурсантаў: шырока былі прадстаўлены вырабы майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — вышыўка, разьба па дрэве, кераміка, карціны мастакоў розных нацыянальнасцяў. Прычым так актыўна рыхтаваліся да фестывалю не толькі дарослыя — у абласных і Мінскім гарадскім фестывалях узяла ўдзел значная колькасць дзяцей.

***— Сёлета ў праграме фестывалю — больш як 40 мерапрыемстваў, з іх амаль палова новых. Што, акрамя прывычнага тэатралізаванага шэсця на адкрыцці фэсту, конкурсу «Нацыянальны падворак», гала-канцэрта творчых калектываў, убачаць у гэтыя дні жыхары і госці Гродна?***

— На заключным этапе VII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур арганізатары прапаноўваюць 43 святочныя мерапрыемствы, з якіх 17 будуць увасоблены ўпершыню. Так, упершыню на ўсіх падворках будуць паказаныя фрагменты традыцыйных вясельных абрадаў. Дарэчы, колькасць самих нацыянальных падворкаў павялічыцца да 21, прычым два з іх будуць шматнацыянальнымі: аб'яднанні з Барысава і Мінска размесцяцца на падворку «Шматгалоссе», а замежныя студэнты з трох гродзенскіх ВНУ створаць падворак «Студэнцкі карагод». У асобнай праграме на свяце нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва выступяць танцавальныя калектывы, адбудзецца конкурс выканаўцаў эстраднай нацыянальнай песні, а для дзяцей падрыхтаваныя святы нацыянальнага эстраднага мастацтва «Сем вясёлкавых нот» і нацыянальнай паэзіі — «Зялёнае лета». Упершыню адбудзецца выстава нацыянальных друкаваных выданняў, канцэрт прафесійных артыстаў розных нацыянальнасцяў нашай краіны.

Але і ад пэўных традыцый, якія склаліся за час правядзення гэтага агульнага свята, мы не збіраемся адмаўляцца. Як заўжды, чакаецца вялікае і маляўнічае шэсце ўдзельнікаў, абсталяванне нацыянальных падворкаў у цэнтры Гродна. Падчас улюбёнага гасцямі фестывалю падарожжа па падворках можна будзе пакаштаваць і ацаніць стравы нацыянальнай кухні, набыць вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, паслухаць радыёканцэрты з твораў гістарычнай радзімы, праграму нацыянальнага гумару. Другі фестывальны дзень адкрыецца шэсцем творчых калектываў Гродна і вобласці, у трэці запланаваны гала-канцэрт майстроў эстрады ўсіх абласцей Беларусі. Адбудуцца таксама канцэрты Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча, ансамбля танца, музыкі і песні «Белыя росы», парад і канцэрт духавых аркестраў горада. З гісторыяй фестывалю госці і ўдзельнікі змогуць пазнаёміцца на адмысловай фотавыставе «Старонкі гісторыі...».

Увогуле, лічыць Марыя Бірукова, фестываль гэты — важная і прыкметная старонка ў творчым жыцці краіны. Бо гэта не проста чарговая творчая справаздача за 2 гады, а вялізнае, без нацыянальных, канфесійных і іншых рамак, агульнае свята — прывабнае па форме і глыбокае па змесце. Бо вучыць усё шматнацыянальнае насельніцтва Беларусі берагчы свае карані і разам з тым паважаць культуры суседзяў, жыць у міры і згодзе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ЛЮБІ СВАЁ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Жудасна — нават успамінаць цяпер — верталёт зверху, міліцыя на машынах, з мігалкамі спераду, ззаду, з бакоў і калона — 48 аўтобусаў. У Кацярыны Андрэеўны ці не самыя меншыя былі — лічы, ад году.

У Светлагорску, у раёне, для сустрэчы гэтага «кантынгенту» падрыхтавалі памяшканні. Кацярына Андрэеўна са сваім садком два паверхі заняла — 8-ы і 9-ы (!) — у выселеным інтэрнаце. Да 28 мая там пражылі. Потым — паехалі далей, яшчэ далей ад бяды: у Гродзенскую вобласць. Там у вёсцы Пархімаўцы Бераставіцкага раёна сваіх дзяцей перавялі з памяшкання садка ў школу, а ім, чарнобыльцам, аддалі садок. Добра, як быццам? Але ж праблемы былі.

— На кухні спачатку вяскоўкі працавалі. Вячэру ў палове сёмай дзецям дадуць і па дамах. Там жа свае сем'і, свае гаспадаркі. А лета на двары, дзень доўгі, дзяцей спаць не ўложыш. У кабінеты, за мною, цугам: «Кацярына Андрэеўна, мы есці хочам». Што было рабіць? Скідваліся з выхавацелькамі, аддавалі свае грошы, ішлі ў магазін, куплялі каўбасу, буракі гарнірныя ў паўлітровых слоіках, хлеб... Так і кармілі. Потым загадчык райана прыехаў, пытаецца, якія ёсць праблемы? Так і так, яму кажу... «Што прапануеце?». А я са сваімі ўжо пагаварыла. Кажу: «Мы самі будзем гатаваць». Дзеці тады і аджылі!.. Дзякуючы добрым людзям. Галоўны ўрач райбальніцы Казлоўскі штодзень прыязджаў, намеснік старшыні райвыканкама Лушчык кожны дзень званіў. Дзе што лепшае ў продаж — «Кацярына Андрэеўна, едзьце атрымайце». Дзеці ж там часова былі. Ну як бы ў санаторыі... З санаторным харчаваннем. А 25 жніўня ў Нароўлю вярнуліся. Але садок там не адразу адкрыўся — падушкі з коўдрамі папалілі (бо «зашкальвалі»), салдаты пясок з пясочніц павывозілі, кусты павыкопвалі... Сад наш ведамасны, ад ПМК меліярацыі. Начальнік там быў Барыс Іванавіч Цімафееў — не чалавек — золата. Ніколі ні ў чым не адмовіў...

Бяда параскідала насельнікаў той Нароўлі — і па гэтым свеце, і па тым. Няма сярод жывых мужа Кацярыны Андрэеўны, хварэе сама. Горш за тое — хварэе дачка. Але ж жыць трэба. І... ваяваць трэба.

— У доме нашым, чарнобыльскім (тут спачатку адны перасяленцы жылі) сцены прамярзалі, — прызнаецца Кацярына Андрэеўна. — Каму толькі ні пісала пра іх!..



**На (пакуль што...) дробныя звяздоўскія прызы пашчасціла падчас сустрэчы аператару аддзела падпіскі Маладзечанскага РВПС Аксане Паўлаўне САВЯНОК.**

Цяпер гэта праблема вырашана, але, як казалі некалі, «народны кантроль у дзеянні». Дом ведае, калі што — хтохто, а Пятрова так не пакіне...

Сумленна выйграны «Віцязь» гэтай, скажам так, падпісчыцы з характарам, мы ўручылі на галоўнай пошце, потым — прывезлі дамоў. Ледзь не следам у кватэру зайшла паштальён Наталля Коўчур — прынесла свежы нумар газеты, аформіла падпіску на новы квартал.

— «Звязду» я выпісвала і буду выпісваць, — на развітанне сказала жанчына. — А прызы цяпер хай другія выйграюць — з Маладзечна, з Нароўлі, з Бераставіцы... Галоўнае, каб газета выходзіла.

Не вам казаць, яна будзе выходзіць, калі... будзе ДА КАГО ісці... Іншымі словамі — калі будуць падпісчыкі. У апошнія гады іх становіцца менш. На жаль. Па розных прычынах. Па той, што сыходзіць пакаленне людзей, для якіх расходы на падпіску былі гэткімі ж абавязковымі, як на лекі, святло ці хлеб... Па той, што, як бы горка гэта ні гучала, у Беларусі выходзіць з ужытку беларуская мова. Па той, што, што даражэйшымі сталі грошы. Па той, што моладзь аддае перавагу Інтэрнэту. Па той...

У любым выпадку, перафразуючы заклікі на плакатах у Мядзелі, мы, звяздоўцы, пастаянна помнім, што ў адказе за тое, каб жыла найстарэйшая (90-гадовая!) беларуская газета, каб жыла наша мова і край... Незалежны, вольны...

Зрэшты (як ні банальна тое гучыць) у адказе за гэта кожны.

Калі, зразумела ж, любіць — сваю газету, сваю мову, сваю краіну.

**Валянціна ДОЎНАР,**
**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Мінск—Маладзечна—Вілейка—Мядзел—Докшыцы—Лагойск—Лепель—Смалявічы.*

***P.S. Падчас гэтай паездкі мы не планавалі вялікіх сустрэч з чытачамі-падпісчыкамі ў вялікіх актавых залах і Дамах культуры... Спрэс — кароткія, можна сказаць, рабочыя — з кіраўнікамі выканкамаў, раённых вузлоў паштовай сувязі, асобных устаноў, прадпрыемстваў.***

***Прыемна, што ўсюды нас разумелі, усюды — па магчымасці — абяцалі спрыяць, што ў тым жа Маладзечанскім, Мядзельскім, Смалявіцкім, Докшыцкім раёнах з пачатку года «Звязда» не страціла сваіх падпісчыкаў...***

***Не страціць, хочацца верыць, і цяпер. Дай Бог, па краіне ў цэлым. То не забудзьцеся падпісацца.***

## Абзац

**■ Мінскія выратавальнікі эвакуявалі 21 чалавека са шматпавярховага дома па вуліцы Мірашнічэнкі. Прычынай стаў пажар у адной з кватэр, адкуль дзвюх жанчын даставілі ў бальніцу з атручэннем чадным газам. З-за едкага чаду давялося эвакуяваць усіх суседзяў. Прычына пажару, як мяркуецца, — курэнне ў нецвярозым стане.**

■ У Оршы хуліган страляў з пнеўматычнага пісталета ў 78-гадовую пенсіянерку ля яе дома. Высталам пашкоджана вока. Няшчасную шпіталізавалі. Супрацоўнікі міліцыі даволі хутка затрымалі злачынцу — 23-гадовага раней судзімага ў тым ліку і за хуліганства. У яго знайшлі і канфіскавалі пнеўматычны пісталет замежнай вытворчасці, прызначаны для стральбы шротам. Узбуджана крымінальная справа.

**■ У лясным масіве каля вёскі Камароўка Брэсцкага раёна нарад міліцыі заўважыў схованку з 85 бутэлькамі гарэлкі ўкраінскай вытворчасці без акцызных марак. А недалёка ад вёскі Манькавічы Столінскага раёна таксама ў лесе знойдзены «заводзік» самагонкі з 200 літрамі брагі. Па фактах праводзяцца праверкі.**

■ Французская вёсачка Руэ-ан-Шампань атрымала ў спадчыну 37 млн еўра ад памерлага бізнэсмена Сержа Ле Гру, перадаюць інфармагенцтвы. Багаты землеўладальнік памёр летась. Згодна з завяшчаннем, спадчыннікамі яго багацця сталі 715 жыхароў яго роднай вёскі. Таксама частка сродкаў пойдзе жыхарам суседняй вёскі, дзе ў Ле Гру быў яшчэ адзін зямельны ўчастак. Багацей завяшчаў грошы на пэўных умовах — у прыватнасці, жыхары павінны пабудаваць каля 50 дамоў для старых, якія маюць у гэтым патрэбу.



**■ Нацыянальныя штодзённыя газеты Францыі не паступілі ўчора ў кіёскі з-за забастоўкі супрацоўнікаў друкаванай індустрыі. Члены трох прафсаюзаў пратэстуюць супраць рэарганізацыі, якая прадугледжвае скарачэнне 350 працоўных месцаў і закрыцця некалькіх цэнтраў распаўсюджання друку.**

■ За апошнія 15 гадоў больш за 4 тыс. кітайскіх дзяцей названы імем Ааюнь, што абазначае «Алімпійскія гульні». Папулярнасць гэтага імя з'яўляецца выказваннем своеасаблівай падтрымкі летняй Алімпіяды, якая адкрыецца ў Пекіне ў пачатку жніўня. Большасць Ааюняў, паводле сведчання супрацоўнікаў дэпартаментаў, што выдаюць пасведчанні аб нараджэнні, — хлопчыкі. У Кітаі вельмі часта дзяцей называюць імёнамі, якія сімвалізуюць нейкія з'явы ці лозунгі. Сярод найбольш распаўсюджаных — імёны, якія абазначаюць у перакладзе «Абарані Кітай», «Стварыы нацыю» і «Падарожжа ў космас». Амаль 291 тыс. дзяцей носяць імя «Цывілізацыя». Упершыню імя Ааюнь з'явілася ў Кітаі ў 1992 годзе, калі краіна падала заяўку на правядзенне Алімпійскіх гульняў-2000.

**■ Француз, які перанёс інфаркт міякарду і якому медыкі канстатавалі спыненне сэрца, «ажыў» на аперацыйным стале, калі хірургі прыступілі да вымання яго органаў для перасадкі. Згодна з заканадаўствам, у падобных выпадках пацыенты могуць аўтаматычна станавіцца донарамі органаў. Аднак калі хірургі прыступілі да аперацыі, патэнцыйны донар пачаў дыхаць.Медыкі вымушаныя былі спыніць свае маніпуляцыі. Пасля працяглага лячэння пацыент стаў хадзіць і гаварыць.**

■ У васьмі аддаленых сёлах Кіравагградскай вобласці з-за адсутнасці аўтобусаў і па ініцыятыве насельніцтва ўведзены конныя маршруткі, разлічаныя на 12 пасажыраў. У вобласці большасць з 500 сёлаў не мае аўтобусных зносінаў, бо вадзіцелі аўтобусаў адмовіліся абслугоўваць стратныя маршруты. Аб гэтым ішла гаворка на трэцяй Усеўкраінскай нарадзе працаўнікоў пасажырскага аўтамабільнага транспарту.

**■ Міністэрства культуры Ўкраіны прапануе звозіць дэмантаваныя савецкія помнікі ў Чарнобыль. Аб гэтым у аўторак заявіў міністр Васіль Ваўкун падчас візіту ў Кіраваград. «Трэба выдзеліць участак у Чарнобыльскай зоне, каб мы звезлі туды ўсе дэмантаваныя помнікі, зрабілі там музей і вадзілі экскурсіі», — сказаў ён. Дарадца ўкраінскага прэзідэнта Мікалай Жулінскі сцвярджае, што дэмантаваць неабходна каля 20 тыс. савецкіх помнікаў па ўсёй Украіне. Паводле яго меркавання, помнікі, аб якіх ідзе размова, «з'яўляюцца сімваламі таталітарызму і бездзяржаўнасці Ўкраіны». Да такіх, у прыватнасці, ён аднёс манументы камуністычным лідарам, што засталіся ў Кіеве.**

## Поўны абзац

■ Аўстрыйская піваварная кампанія Ottakringer Brauerei AG аб'явіла, што кожны футбаліст зборнай Аўстрыі, які заб'е гол на Еўра-2008, атрымае бясплатнае «пажыццёвае забеспячэнне півам». Выканаўчы дырэктар кампаніі Зігі Менц лічыць, што шанц быць забяспечаным півам да канца жыцця — менавіта тая матывацыя, якая дапаможа аўстрыйскім футбалістам забіваць галы. Ён дадаў, што на працягу першага года будзе дастаўляць піва гульцам асабіста. Пакуль у зборнай Аўстрыі няма ачкоў у чэмпіянаце.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# 13 ФАКТАЎ пра «трынаццатую» пятніцу

### Хочаце — верце...



**Звычайна ў офісных работнікаў пятніца — дзень амаль што святочны, бо сімвалізуе канец працоўнага тыдня. Але толькі не гэтая пятніца, якая выпала на 13-га. Між іншым, такое выпрабаванне ў гэтым годзе нам паслана ўсяго адзін раз (калі не лічыць 13 кастрычніка, што прыпадае на «цяжкі» панядзелак).**

**Самыя прымхлівыя людзі сёння, напэўна, пастараюцца ўвогуле не выходзіць з дому, самыя рызыкоўныя — зладзяць вяселле. А ўсім тым, хто знаходзіцца паміж гэтымі дзвюма крайнасцямі, прапануем некалькі цікавых фактаў з гісторыі «чортавай пятніцы».**

● Невядома дакладна, чаму людзі ўспрымаюць менавіта гэты дзень з такім негатывам. Па адной з версій тэолагаў, менавіта ў пятніцу, 13-га Ева, пачаставала Адама забароненым яблычкам, чым пралюдзі і заслужылі выгнанне з Эдэма. Па другой — у гэты дзень Каін забіў Авеля, але гэтыя згадкі нічым не пацвярджаюцца.

● *Больш пераканаўча выглядае іншая дата — 13 кастрычніка (пятніца, зразумела ж) 1307 года. Пры падтрымцы караля Францыі, Філіпа IV Прыгожага, Папа Рымскі Клімент V, які даўно марыў знішчыць ордэн тампліераў і завалодаць яго багаццямі, развязаў сапраўдную бойню, чым і забяспечыў дню дурную славу ў вяках.*

● У Сярэднявеччы цвёрда верылі, што «чортава пятніца» — найлепшы час для шабашу, куды павінны сабрацца тузін вядзьмарак, а трынаццатым, маўляў, з'яўляўся сам сатана.

● *«Параскевідэкатрыяфобія» — пакуль вымавіш, язык зломіш. Тым не менш, калі вы засцерагаецеся пятніцы, 13-га, гэта менавіта пра вас. Трыскадэкафобія — больш звыклая боязь, самой па сабе лічбы 13 пазбягае кожны пяты еўрапеец.*

● Нумара 13 няма ў нумарацыі дамоў і паверхаў у ЗША, Канадзе і Англіі, у «Формуле-1» няма такога баліду, у авіякампаніях — самалёта, у гатэлях — пакою. Амерыканская эканоміка ў кожную такую пятніцу губляе 800—900 мільёнаў долараў, бо рабіць пакупкі таксама лічыцца дрэнным знакам.

● *Брытанскія хірургі адмяняюць палову ўсіх аперацый, калі тыя прызначаны на 13-е чысло ў пятніцу.*

● У Індыяне (ЗША), паводле законаў штата, уладальнікі ўсіх чорных катоў у пятніцу, 13-га, абавязаны апранаць жывёлам званочкі на шыю. Відаць, каб зберагчы тых ад найбольш прымхлівых суседзяў.

● *У Кітаі, Карэі і Японіі, наадварот, лічба 13 расцэньваецца як шчаслівая, незалежна ад дня тыдню. Затое тут недалюбліваюць «чацвёркі», і, напрыклад, тэлефонныя нумары з гэтымі лічбамі прадаюцца па зніжаных цэнах.*

● Нямецкі сацыёлаг Эдгар Вундэр з Цэнтра Парапсіхалогіі даследаваў амаль 150 тысяч няшчасных выпадкаў, што адбыліся па пятніцах з 1985 па 1999 год. І прыйшоў да высновы, што спалучэнне пятніцы з 13-м чыслом ніколькі не больш страшнае, чым звычайная пятніца.

● *Па традыцыі ў гэты дзень абвастраюцца вірусныя атакі на камп'ютары. Адным з першых вірусаў гэтага плана стаў Jerusalem, які ў пятніцу, 13 мая 1988 года, знішчыў у некалькіх універсітэтах розных краін свету ўсе файлы пры іх запуску. Пазней некаторыя карыстальнікі лічылі за лепшае ўвогуле не ўключаць камп'ютары ў гэты дзень. Астатнія ж... абнаўлялі антывірусныя праграмы.*

● *Ахвярамі пятнічных забабонаў былі Напалеон, Бісмарк, Іаган Вольфганг Гётэ, якія ў такі дзень проста не вылазілі з-пад коўдры і заставаліся ў ложку. Нават прэзідэнт ЗША Франклін Рузвельт ухіляўся ад паездак 13-га чысла. Не любіў пятніцу, 13-га Зігмунд Фрэйд, які, праўда, знайшоў псіхалагічнае тлумачэнне гэтаму факту — «адлюстраванне ўласнага падсвядомага памкнення да бессмяротнасці».*

● Паводле народных павер'яў, у пятніцу, 13-га, каб пазбегчы непрыемнасцяў, трэба з раніцы, перахрысціўшыся, прачытаць «Ойча наш», а затым сказаць: «Святая пятніца мацней, а я, раб (імя), стаю за ёй, а не за сённяшняй. Амін».

● *Навука аб лічбавым значэнні кожнага слова — гематрыя — раіць ставіцца да лічбы 13 з павагай. Напрыклад, кабалісты, сярод якіх нямала знакамітых людзей, «расшыфроўваюць» лічбу словам «ахава» — «любоў». (Слова складаецца з чатырох літар, кожная з якіх мае лічбавы адпаведнік: алеф — 1, бэйт — 2, дзве хэй — 5 і 5, у суме — 13).*

...І няхай гэта пятніца пройдзе для вас без непрыемных наступстваў!

**Ліна МАЛІНІНА.**

# БЕЛАГРАПРАМБАНК ЗА ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

### Упершыню капітал беларускага банка перавысіў 1 млрд долараў

**Справаздача ААТ «Белаграпрамбанк» за мінулы год, падрыхтаваная ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі фінансавай справаздачнасці (МСФС), сведчыць аб дынамічным развіцці і ўмацаванні фінансавага становішча банка.**

Актывы банка, згодна з іх ацэнкай у адпаведнасці з МСФС, павялічыліся за 2007 год на 47 працэнтаў і склалі на 1 студзеня 2008 года 8,1 трыльёна рублёў, у тым ліку прырост крэдытных укладанняў ацэньваецца ў 59 працэнтаў (да 6,8 трлн рублёў). Сродкі кліентаў (уключаючы банкі) павялічыліся амаль на 65 працэнтаў і дасягнулі 5,2 трыльёна рублёў. Напрыканцы 2007 года капітал ААТ «Белаграпрамбанк», разлічаны ў адпаведнасці з падыходамі, вызначанымі Міжнародным канвергенцыяй вымярэння і стандартаў капіталу Базель 2, склаў 2,2 трыльёна рублёў (1011 мільёнаў долараў ЗША) і вырас за справаздачны перыяд на 26 працэнтаў. Каэфіцыент дастатковасці капіталу на 1 студзеня 2008 года складае 30,9 працэнта пры мінімальна неабходным значэнні ў 8 працэнтаў. Аперацыйны прыбытак банка за 2007 год, згодна з МСФС, склаў 83,2 мільярда рублёў, што на 25 працэнтаў перавышае паказчык папярэдняга года. Практычна такімі ж тэмпамі павялічыўся і чысты прыбытак ААТ «Белаграпрамбанк», сумарная велічыня якога склала 52,2 мільярда рублёў. Дакладнасць фінансавай справаздачнасці ААТ «»Белаграпрамбанк» за 2007 год, падрыхтаванай у адпаведнасці з МСФС, пацверджана аўдытарскай кампаніяй «Дэлойт і Туш».

**Алена КРАВЕЦ.**

### «ДЫВІДЭНДЫ» ПАДАЗРОНАГА

Заснавальнік ЗП, якое зарэгістравана ў Мінску, падазраецца ў махлярстве, якое прынесла яму неблагія «дывідэнды». Пытанні ў следства ўзніклі да 43-гадовага грамадзяніна Латвіі адносна яго «здзелкі» ў кастрычніку мінулага года. Як мяркуецца, тады падазроны падчас пастаўкі ацяпляльнага катла КУП «Клецкая ЖКГ» махлярскім шляхам завалодаў 141 мільёнам рублёў. Папярэднім расследаваннем УУС Мінаблвыканкама па матэрыялах падраздзяленняў БЭЗ УУС і Клецкага РАУС у дачыненні да заснавальніка замежнага прадпрыемства ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ТРЭЦЯЯ ЛІНІЯ ЗВЯЖА ЗЯЛЁНЫ ЛУГ З КУРАСОЎШЧЫНАЙ

Будаўніцтва першага ўчастка трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна пачнецца ў 2010 годзе. Яна звяжа мікрараёны Зялёны Луг і Курасоўшчына і будзе ўключаць 14 станцый. Аб гэтым паведаміў начальнік КУП «Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна» Васіль Жыбуль. Першы ўчастак плануецца здаць у эксплуатацыю да 2017 года.

**Максім ГУЛЯКЕВІЧ, «Мінск—Навіны».**

**Территориальный центр социального обслуживания населения при управлении по труду, занятости и социальной защите Лунинецкого райисполкома**

**ПРОВОДИТ ТЕНДЕР**

по приобретению грузопассажирского автомобиля ГАЗ-33023 7—8 посадочных мест, цельнометаллический фургон.

*Тендерные предложения принимаются по адресу: 224644 г. Лунинец Брестской обл., ул. Красная, 1 тел.: 8(01647)21445, 21142, 23401.*

УНП 200161989

**СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР**

**по приобретению станка «Обрабатывающий центр».**

*Предложения принимаются в течение 10 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205 86 00, тел. 205 85 26, Тельтевский В.Н.*

УНН 190050257

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**
**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка с применением метода понижения начальной цены**

| Наименование предмета аукциона | Здание «Торговый центр» и право заключения договора аренды земельного участка | Незавершенный строительством детский санаторий на 210 мест и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Микашевичи, ул. Мелиоративная, 2 | Брестская обл., Кобринский р-н, д. Пески |
| Продавец недвижимого имущества | ГУПП «Лунинецкое ПМС», тел. (01647) 2 64 19 | УЗ «Детская областная больница», тел. (0162) 20 95 84 |
| Характеристика предмета аукциона | Здание двухэтажное, 1975 г.п., площадь – 843,9 кв. м, фундамент бетонный, стены кирпичные, имеются коммуникации. Земельный участок площадью 0,1757 га для размещения объектов производства, срок аренды – 99 лет | Начало строительства – 1992 г. Здание главного корпуса 3-этажное с цокольным этажом каркасно-панельной конструкции, площадь – 5765 кв. м, готовность строения – 43 %; одноэтажное здание изолятора – 60 % готовности; 90 % готовности фундаментов хозкорпуса, котельная; проходная водозабора, насосная станция 2 подъема (кирпичное, без кровли), резервуары для хранения воды, напорный коллектор, артскважина, ж/б ограждение территории. Земельный участок площадью 6,85 га (участок № 1 – 5,1 га, участок № 2 – 1,75 га) с ограничениями в использовании земель в водоохраной зоне р. Мухавец, срок аренды – 99 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 273 454 281 | 6 113 542 900 |
| Минимальная цена предмета аукциона, руб. | 61 054 162 | 1 253 860 900 |
| Сумма задатка, руб. | 30 000 000 | |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642202530011 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538. | |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 06, www.brest-region.by* | |

Аукцион состоится **24 июня 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату (часть платы – в случае рассрочки) за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен Инструкцией о порядке продажи объектов коммунальной собственности Брестской области на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденной решением Брестского областного Совета депутатов от 18 мая 2007 года № 24, и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

**Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 23 апреля 2008 г. № 77.**

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 23 июня 2008 года включительно.***

УНП 200020538

## Вакол Еўра

EURO2008 Austria-Switzerland

# Выяўлены першыя чвэрцьфіналіст і няўдачнік

11 чэрвеня на Еўра-2008 пачаліся матчы другога тура групавога этапа. У Жэневе сышліся зборныя Чэхіі і Партугаліі, на кон была пастаўлена пуцёўка ў чвэрцьфінал, і Партугалія яе атрымала разам з перамогай 3:1. У другім матчы гэтага дня паміж зборнымі Швейцарыі і Турцыі выявіўся няўдачнік, які пакідае турнір на групавым этапе. Зборная Швейцарыі саступіла 1:2. Учора адбыліся матчы ў групе B. Сустракаліся каманды Харватыі і Германіі, Аўстрыі і Польшчы.



Партугальцы аказаліся на галаву вышэй за чэхаў.

А галоўны трэнер зборнай Партугаліі Луіс Філіпэ Скалары ўзначаліць лонданскі «Чэлсі». Ён прыступіць да работы з клубам з 1 ліпеня. «Чэлсі» займаецца пошукамі галоўнага трэнера пасля майскай няўдачы ў фінальным матчы Лігі чэмпіёнаў з «Манчэстар Юнайтэд» і адстаўкі ізраільскага спецыяліста Аўрама Гранта. У полі зроку кіраўніцтва клуба, акрамя Скалары, знаходзіліся Карла Анчэлоці, Гус Хідынк, Лучана Спалеці.

## Турак памёр ад радасці

Перамога, атрыманая зборнай Турцыі над камандай Швейцарыі, абярнулася трагедыяй. Ад радасці за поспех сваіх футбалістаў, якія абыгралі гаспадароў, у аднаго з турэцкіх балельшчыкаў не вытрымала сэрца. Спробы зрабіць фанату штучнае дыханне ні да чаго не прывялі. Турак памёр.

## Радыкальныя палякі помсцяць Падольскі

Правыя радыкальныя палітыкі патрабуюць пазбавіць польскага грамадзянства Лукаса Падольскі. Мірасла́ў Арзяхоўскі, член адной з палітычных партый краіны, заявіў, што будзе падаваць у суд у тым выпадку, калі прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі адмовіцца задаволіць яго патрабаванне і не адбярэ ў Падольскі польскі пашпарт. Выступленне Арзяхоўскага адбылося пасля таго, як форвард «Баварыі» і зборнай Германіі, уладальнік двайнога грамадзянства Лукас Падольскі зрабіў дубль у вароты нацыянальнай каманды Польшчы ў матчы чэмпіянату Еўропы. «Калі чалавек абараняе колеры сцяга іншай дзяржавы, гэтага дастаткова для таго, каб пазбавіць яго грамадзянства. Падольскі прадэманстраваў сваю пазіцыю — ён выбірае Германію, і павінен быць пазбаўлены грамадзянства Польшчы», — заявіў Арзяхоўскі.

Тут неабходна нагадаць, што Падольскі не стаў бурна святкаваць ні адзін са сваіх галоў у вароты палякаў, растлумачыўшы пасля матча, што яго сэрца дагэтуль належыць Польшчы. Ён не толькі не стаў скакаць і ўсміхацца, але нават схапіўся за галаву, быццам бы шкадуючы аб тым, што зрабіў. «Польшчы належыць маё сэрца. Я з'ехаў з гэтай краіны, калі мне было два гады, але мой бацька, дзядзька і іншыя сваякі дагэтуль там жывуць. І я захаваў глыбокую павагу да гэтай краіны,» — сказаў сам футбаліст. Падтрымалі яго і члены нацыянальнай каманды Германіі. Олівер Бірхоф, менеджар зборнай, ацаніў жэст Падольскі як вельмі ўразлівы. Апладысментамі праводзілі іграка з поля нават фанаты зборнай Польшчы. А незадаволенымі яго паводзінамі засталіся толькі радыкальныя палітыкі.

## Гол ледзь не каштаваў Вілы пальца

Галоўным магільшчыкам зборнай Расіі ў матчы супраць зборнай Іспаніі стаў форвард «Валенсіі» Давід Вілья. Аднак, як высветлілася пасля, ён мог пакінуць поле ўжо пасля першага ж голу ў вароты Ігара Акінфеева. І хто ведае, чым бы скончыўся матч, калі б Вілья быў заменены яшчэ ў першым тайме?

Справа ў тым, што першы гол ледзь не каштаваў Вілы зламанага пальца. У момант святкавання гэтага мяча форвард Іспаніі пашкодзіў палец на руцэ. Як расказаў футбаліст, гэта адбылося, калі ён... абдымаўся з Фернанда Торэсам. Але, як паказала абследаванне, траўма аказалася не надта сур'ёзнай, і Вілья, атрымаўшы дапамогу ўрачоў, застаўся на полі.

Звязаны з Вільяй яшчэ адзін кур'ёзны эпізод у гэтым матчы. Пасля фінальнага свістка аўтар хет-трыку падышоў да арбітра Конрада Плаутца і папрасіў на памяць той мяч, якім праводзілася сустрэча. Аднак на англійскай Вілья размаўляе не вельмі, і Плаутц проста не зразумеў, што ад яго хоча футбаліст. У якасці перакладчыкаў выступілі Пепе Рэйне і Хабі Алонса, якія гуляюць у прэм'ер-лізе і ведаюць англійскую куды лепш.

## Расіян затрымалі за падробку білетаў

Перад стартавым матчам зборнай Расіі на чэмпіянаце Еўропы была арыштавана група расійскіх грамадзян, якім было прад'яўлена абвінавачанне ў выкарыстанні фальшывых білетаў. Раней улады Аўстрыі і Швейцарыі заяўлялі, што гандлю падробленымі білетамі на Еўра яны не дапусцяць.



У той жа дзень чацвёра расіян былі вызвалены з паліцэйскага ўчастка. Пасля правядзення следчых мерапрыемстваў паліцыя прыйшла да высновы, што расійскія балельшчыкі не мелі дачынення да незаконнай дзейнасці з білетамі на гульні Еўра-2008. У балельшчыкаў папрасілі прабачэння і пажадалі ўдачы зборнай Расіі. Такія скандалы часта ўзнікаюць на буйных міжнародных турнірах, падчас якіх у абароце заўсёды сустракаюцца фальшывыя білеты. Ва ўмовах, калі за білеты прыезджыя гатовыя аддаць любыя грошы, ствараецца вялікая прастора для зламыснікаў.

## Трэніроўка зборнай Расіі сабрала аншлаг

Першая трэніроўка зборнай Расіі па футболе пасля паражэння ад іспанцаў прайшла ў Леагангу пры поўным аншлагу, прычым перапоўненасць трыбун забяспечылі расійскія балельшчыкі. Да гэтага асноўную частку гледачоў на трэніровачнай базе складалі мясцовыя жыхары. Невялікі сектар для балельшчыкаў у сераду цалкам быў запоўнены. Гледачы сабраліся задоўга да прыбыцця расіян. А першае з'яўленне футбалістаў трыбуны ўспрынялі неадназначна: хтосьці крычалкамі імкнуўся падбадзёрыць каманду, а хтосьці наадварот, выкрыкваў непрыемныя, але справядлівыя словы.

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЧЭРВЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 23 (15527)

# СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ БЕЗ... УСТУПНАГА ІСПЫТУ?

**Без рызыкі памыліцца можна адзначыць, што пераважная большасць з 27 тысяч сёлетніх выпускнікоў мінскіх школ зробіць традыцыйны выбар і паспрабуе паступіць у ВНУ ці сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Аднак намеры і магчымасці супадаюць далёка не заўсёды. І справа не толькі ў конкурсе: для працягу пасляшкольнага навучання на ўсіх проста не хопіць месцаў. Як вынік, ужо зараз спецыялісты робяць прагноз — у службы занятасці можа прыйсці больш за тысячу маладых мінчан.**

## Попыт на прафпадрыхтоўку

6 тысяч беспрацоўных на 20 тысяч вакантных месцаў. На першы погляд, сёння на рынку працы сталіцы няма вялікіх цяжкасцяў з уладкаваннем па рабочых спецыяльнасцях. У прыватнасці, найбуйнейшаму гораду краіны патрабуецца вялікая колькасць маляроў, тынкоўшчыкаў, электрагазазваршчыкаў, электрамеханікаў, электраманцёраў, гандляроў харчовымі і нехарчовымі таварамі, трактарыстаў, медсёстраў, афіцыянтаў, кухараў, швачак, кантралёраў-касіраў, апроч таго, ёсць попыт на інжынераў і кіраўнікоў рознага ўзроўню. І разам з тым нельга не заўважыць: усе пералічаныя заяўкі павінны быць «падмацаваныя» адпаведнай прафесійнай падрыхтоўкай, а пажадана — і вопытам. Між тым, ні першага, ні другога ў выпускніка школы няма.

— Зразумела, можна ўладкавацца на некваліфікаваныя месцы, скажам, дапаможным рабочым, грузчыкам ці прыбіральшчыкам — попыт тут таксама існуе, — кажа начальнік аддзела прафарыентацыі і прафесійнай падрыхтоўкі Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ларыса Каткова. — Аднак у дадзеным выпадку паўстаюць пытанні прэстыжу і часта невялікіх заробкаў. Да таго ж варыянт некваліфікаванага месца планаваць на ўсё жыццё нельга, у такім выпадку шанцы знайсці калі-небудзь добрую высокааплатную работу ўвогуле зводзяцца да нуля.

## Ад трактарыста да цырульніка

«Стандартная» формула павышэння канкурэнтаздольнасці на рынку працы выглядае даволі проста: не атрымалася стаць студэнтам ВНУ — спрабуй трапіць у сярэднюю спецыяльную ўстанову, не склалася з ССНУ — узгадай аб прафесійна-тэхнічных вучылішчах. Аднак свае нюансы ёсць і тут. Скажам, апошнім часам не было вялікіх праблем з паступленнем у ССНУ і ПТВ на будаўнічыя ці машынабудаўнічыя спецыяльнасці. А вось колькасць ахвотнікаў асвоіць у тэхнікумах і прафтэхвучылішчах спецыяльнасці, звязаныя з электронікай, камп'ютарнымі тэхналогіямі, дызайнам або цырульніцкай справай, ужо наадварот перавышала колькасць месцаў.

— Нельга не ўзгадаць і яшчэ адзін даволі важны момант, — працягвае Ларыса Каткова. — Звычайны тэрмін навучання ў ПТВ на базе 11 класаў складае ад 10 месяцаў да 1 года 9 месяцаў, а значыць, гэта не стасуецца з планамі тых, хто хоча паўтарыць спробу паступлення ў ВНУ або ССНУ налета. Зрэшты, кожны няўдачнік прыёмнай кампаніі можа атрымаць спецыяльнасць і іншым чынам — на курсах прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі па накіраваннях службы занятасці.

Сёння ў сталіцы па падобных накіраваннях магчыма прайсці падрыхтоўку па 46 спецыяльнасцях. Да прыкладу, навучанне вядзецца на адміністратара, вадзіцеля пагрузчыка, кабельшчыка-спайшчыка, кладаўшчыка, кандытара, кухара, кантралёра-касіра, гандляра харчовымі і нехарчовымі таварамі, машыніста крана, машыніста халадзільных установак, маркетолага, маляра, тынкоўшчыка, абліцоўшчыка-плітачніка, мантажніка сантэхсістэм і абсталявання, аператара кацельні, аператара сувязі, страхара, аператара ПЭВМ з веданнем апрацоўкі баз даных ці веданнем камп'ютарнай вёрсткі, графікі і дызайну, афіцыянта, бармена, буфетчыка, швачкі, сакратара справаводства, слесара па рамонце аўтамабіля, прадпрымальніка, электрагазазваршчыка, электраманцёра па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, цырульніка, трактарыста, пераплётчыка, столяра-станочніка дрэваапрацоўчых станкоў.

Сярэдняя працягласць заняткаў складзе 4,2 месяца. Прычым максімальны тэрмін вызначаны ў 11, а мінімальны — усяго ў 1,9 месяца.

Урэшце, трэба падкрэсліць: пасля навучання ў абавязковым парадку выдаецца пацвярджальны дакумент пэўнага ўзору.

— Навучанне праходзіць па дзённай форме ў акрэдытаваных установах адукацыі, — адзначае Ларыса Каткова. — І, да слова, абавязковая вучэбная нагрузка вызначана ў 36—40 гадзін у тыдзень, але не больш, чым 8 гадзін у дзень.

## Галоўная ўмова — рэгістрацыя

Час навучання на дзённай форме залічваецца ў стаж. Але галоўнае — набыццё прафесіі будзе цалкам бясплатным. Больш за тое, навучэнцу гарантуюцца зноў-такі бясплатны медагляд і выплата стыпендыі. Праўда, разлічваць на ўсё гэта можна толькі ў адным выпадку — пры наяўнасці накіравання ад службы занятасці.

У сваю чаргу накіраванне выдаецца толькі беспрацоўным, а гэта значыць, што перш-наперш трэба стаць на ўлік у той жа службе занятасці свайго раёна. І, дарэчы, зрабіць гэта ніколі не позна — паставіць на ўлік могуць ад 16-гадовага і да «пенсійнага» ўзросту.

Апроч рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага, выпускніку трэба прадаставіць пашпарт і атэстат, а ў выпадку неабходнасці і іншыя дакументы — скажам, інваліду давядзецца таксама прынесці адпаведнае пасведчанне і працоўныя рэкамендацыі медыка-рэабілітацыйнай камісіі. А наступнымі крокамі стануць прафкансультаванне для выяўлення здольнасцяў да пэўнага віду заняткаў і праходжанне медагляду ў паліклініцы па месцы жыхарства.

— Падобныя ўмовы дзейнічаюць не толькі ў Мінску, яны аднолькавыя для ўсіх рэгіёнаў Беларусі, — распавядае Ларыса Каткова. — Таму нават пры жаданні працаваць у сталіцы немінчане павінны цікавіцца варыянтамі курсавой падрыхтоўкі менавіта ў сваім раёне. А што ж да выбару канкрэтнай спецыяльнасці, то ў такім выпадку можна нагадаць — з пералікам найбольш актуальных для найбуйнейшага горада Беларусі вакансій можна пазнаёміцца на сайце www.minsk.gov.by/rabota.

## Дыпломаў «лішніх» не бывае

Навучанне ці перанавучанне па накіраваннях службы занятасці робіцца па найбольш запатрабаваных на рынку спецыяльнасцях, таму, як паказвае аналіз, паказчык далейшага ўладкавання складае 80 працэнтаў. І ўсё ж больш шанцаў на атрыманне работы дае заключэнне трохбаковага дагавора паміж службай занятасці, беспрацоўным і наймальнікам. Падчас заключэння такога дагавора служба занятасці бярэ на сябе абавязак наладзіць за кошт бюджэтных сродкаў навучанне, беспрацоўны — прайсці курс навучання і атрымаць дыплом, а наймальнік — прадставіць працоўнае месца. Падрыхтоўка становіцца адраснай, пад канкрэтную патрэбу, і ў такім выпадку праблем з пошукам вакансій не ўзнікае.

Аднак ісці на заключэнне трохбаковага дагавора неабавязкова, пасля заканчэння вучобы беспрацоўны можа шукаць варыянты самастойна або... не шукаць увогуле. Прынамсі, ніякай «адпрацоўкі» па асвоенай на курсах спецыяльнасці заканадаўства не прадугледжвае. Магчыма проста набыць прафесію «для сябе». Бо ёсць вялікая верагоднасць таго, што гэта прафесія спатрэбіцца ў будучым.

— Атрымаць дадатковую спецыяльнасць ніколі не будзе лішнім, — заўважае Ларыса Каткова. — Таму, да прыкладу, мы вітаем студэнтаў завочных ці вячэрніх аддзяленняў, якія выказваюць жаданне паралельна набыць на курсах рабочую прафесію. Другую прафесію можна набыць зноў-такі бясплатна, прычым, як правіла, гэта прафесія аказваецца сумежнай з асноўнай. А значыць, яшчэ падчас навучання ў ВНУ той жа завочнік можа не толькі пачаць зарабляць грошы, але і пазнаёміцца з работай па выбраным напрамку вышэйшай адукацыі «знутры». А ў любым выпадку гэта — добры старт кар'еры.

**Сяргей ГРЫБ.**

# «Алімпія-2008»: культурна і па-спартыўнаму

**У Год здароўя, багаты на спартыўныя падзеі, галоўнай з якіх стане Алімпіяда ў Пекіне, пройдзе штогадовы фестываль здаровага ладу жыцця з сугучнай назвай «Алімпія-2008».**

Трыццаць камандаў міністэрстваў і ведамстваў, абласных выканаўчых камітэтаў, абласных камітэтаў БРСМ, сродкаў масавай інфармацыі сабраліся на тры дні (13—15 чэрвеня) на беразе ракі Ісдач. Фестываль праходзіць у пяты раз і арганізаваны саюзам моладзі сумесна з Белтэлерадыёкампаніяй, газетай «Советская Белоруссия», Міністэрствам спорту і турызму, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам інфармацыі, Валожынскім райвыканкамам.

Сёння ўвечары на беразе Ісдачы з'явіцца палатачны гарадок і адбудзецца адкрыццё фестывалю з прэзентацыяй камандаў-удзельніц. На сцэне разгорнецца тэатралізаваны паказ з факельным шэсцем. Традыцыйна пройдзе акцыя «Памяць», прымеркаваная да 22 чэрвеня, — прадстаўнікі кожнай каманды апусцяць у раку Ісдач вянкі з жывых кветак з запаленымі свечкамі. Завершыць першы дзень фестывалю канцэртная праграма маладых выканаўцаў беларускай эстрады.

У другі дзень, 14 чэрвеня, пройдуць асноўныя спартыўныя мерапрыемствы — спаборніцтвы па пляжным валейболе, на паласе перашкод, па гіравым спорце, перацягванні каната, тэхніцы турызму і іншых відах спорту. Культурная праграма прадугледжвае конкурс плакатаў па прапагандзе здаровага ладу жыцця, нумары мастацкай самадзейнасці, спаборніцтва ў афармленні месца пражывання каманды, прыгатаванне лепшай паходнай стравы, фотаконкурс «Алімпія ў кадры» на самы арыгінальны фотаздымак. Актыўнасць кожнай каманды будзе ацэньвацца спецыяльнымі жэтонамі, па колькасці якіх і вызначацца пераможцы, якія 15 чэрвеня, у дзень закрыцця фестывалю, будуць узнагароджаны прызамі, а таксама атрымаюць кубак ад каманды-пераможцы мінулага года.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Каб стаць моцнымі...

**Амаль 600 хлопчыкаў асвояць асновы ваеннай навукі ў лагерах адпачынку ўнутраных войскаў МУС Беларусі: з пачатку лета на базе злучэнняў і вайсковых часцей унутраных войскаў у Мінску, Віцебску, Брэсце, Гродне, Бабруйску пачалі работу восем летніх ваенна-спартыўных патрыятычных лагераў для няпоўнагадовых падлеткаў.**

У іх змогуць адпачыць больш за 450 школьнікаў (большасць якіх з няўдалых сем'яў), многія знаходзяцца на ўліку ў міліцыі. Да канца лета ў злучэннях і вайсковых часцях, якія дыслакуюцца ў Магілёве, Гомелі і Бабруйску, адкрыюцца яшчэ 3 ваенна-спартыўныя лагеры, дзе з вайсковым жыццём пазнаёміцца больш за сотню падлеткаў.

Кожная змена доўжыцца ў сярэднім 15 дзён. Строгая дысцыпліна ў спалучэнні з вайсковай зладжанасцю суправаджаюць увесь працэс выхавання і навучання ў лагеры. Падлеткаў знаёмяць з баявой тэхнікай і зброяй, вучаць прыёмам самаабароны. Арганізуюцца наведванні памятных месцаў, выстаў, музеяў.

Галоўная мэта такіх лагераў — грамадзянска-патрыятычнае, духоўна-маральнае выхаванне дапрызыўной моладзі, падрыхтоўка яе да нясення вайсковай службы.

**Кар. «Ч.З.».**

# Амаль кожны пяты малады мінчанін уступіў у БРСМ

**Усяго ў Мінску жывуць больш як 500 тысяч чалавек ва ўзросце ад 14 да 31 года.**

Больш за ўсё БРСМаўцаў сярод студэнтаў. У кожнай ВНУ сталіцы сфарміраваны пярвічкі грамадскай арганізацыі. Прычым дваццаць з іх надзелены правамі раённых камітэтаў. Папулярны саюз моладзі сярод рабочай моладзі і старшакласнікаў.

У сталічных школах працуюць 245 пярвічак, а на прадпрыемствах Мінска створаны 960 пярвічных арганізацый.

**Вольга ШАЎЧУК, «Мінск—Навіны».**





# ТЭСЦІРАВАННЕ ПАЧАЛОСЯ!





У Беларусі стартаваў асноўны этап уступнай кампаніі. Цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове прайшло ўчора, 12 чэрвеня. У Беларускім дзяржаўным універсітэце ў першы дзень іспытаў удзел у іх прынялі больш за дзве тысячы выпускнікоў з усёй краіны. Без прыгодаў не абышлося і сёлета — зноўку забываліся дома пашпарты і ручкі. Ад стрэсу хлопцы і дзяўчаты забываліся не толькі нумары сваіх аўдыторый, у якіх павінны пісаць тэсты, а нават і свае прозвішчы. Толькі бацькі паслухмяна сядзелі ў дворыку ўніверсітэта і чакалі сваіх дзяцей з мінералкай і бутэрбродамі. Увесь чэрвень у абітурыентаў — гарачая пара: сёння, 13 чэрвеня, пройдзе тэсціраванне па рускай мове, 15 — па гісторыі Беларусі, 17 — Сусветнай гісторыі навейшага часу, 19 — па матэматыцы, 21 — па прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава», 22 — па геаграфіі, 23 — па фізіцы, 25 — па біялогіі, 27 — па замежных мовах і 28 — па хіміі. У добры шлях, абітурыент-2008!

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

Пыталіся? Адказваем

# Усіх школьнікаў — пад адзін грэбень?

Ці праўда, што ў школе могуць прымусіць усіх вучняў насіць адзенне аднаго колеру? З такім пытаннем у «Звязду» звярнуліся вучні адной са сталічных школ. Маўляў, школы напрыканцы навучальнага года атрымалі з Міністэрства адукацыі нейкую інструкцыю наконт дзелавога стылю адзення, у якой змяшчалася патрабаванне зацвердзіць камплектнасць адзення і яго колер. Няўжо ўсе школьнікі павінны стаць аднатыпнымі? І што ў такім разе рабіць дзяўчатам, якія прызвычаіліся да касцюмаў са штанамі: пераходзіць на спадніцы ці сарафаны, калі так вырашыць кіраўніцтва школы?

Каб высветліць сітуацыю, мы звярнуліся ва ўпраўленне агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі нашай краіны.

— З наступнага навучальнага года ўсе школьнікі, уключаючы старшакласнікаў, павінны перайсці на адзенне дзелавога стылю, — патлумачыла намеснік начальніка ўпраўлення Валянціна Маеўская. — На інтэрнэт-сайце Мінадукацыі (www.minedu.unibel.by), а таксама на сайце канцэрна Беллегпрам (www.bellegprom.by) можна знайсці ўзоры мадэляў адзення дзелавога стылю і пералік прадпрыемстваў, якія іх выпускаюць. Навучэнцы і іх бацькі сумесна з адміністрацыяй навучальнай установы і педагагічнымі работнікамі маюць права выбару мадэлі, колеру і якасці тканін для школьнага адзення.

У мэтах захавання адзінага падыходу да вырашэння пытання аб увядзенні адзення дзелавога стылю агульнаадукацыйным установам было рэкамендавана на Савеце навучальнай установы прыняць рашэнне аб увядзенні дзелавога стылю адзення для ўсіх навучэнцаў, зацвердзіць патрабаванні да яе камплектнасці і колеру і адлюстраваць дадзенае пытанне ў статуце і правілах унутранага распарадку, абавязковых для выканання. Хачу заўважыць, што ў Савет навучальнай установы ўваходзяць бацькі вучняў усіх класаў і іх меркаванні могуць не супадаць. Як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, на адзенне аднаго фасону ці каляровай гамы могуць пераходзіць, напрыклад, вучні пачатковай школы ці вучні асобнага класа. У любым выпадку без згоды бацькоўскага камітэта гэта пытанне не можа быць вырашана.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ДАВЕДКА «Ч.З.»:**

*Міністэрства адукацыі дае наступнае азначэнне паняццю «дзелавы стыль»:*

*«Дзелавы стыль адзення — гэта строгі вытрыманы стыль адзення, прызначаны для наведвання навучэнцамі вучэбных заняткаў у агульнаадукацыйных установах. Увядзенне дзелавога стылю адзення мае на мэце выхаванне правілаў этыкету ў падрастаючага пакалення, уменне ранжыраваць адзенне на розныя стылі і разумець значэнне па яго прымяненні.*

*Камплект адзення дзелавога стылю павінен быць шматфункцыянальным, гігіенічным, зручным і адпавядаць сучасным накірункам моды. Для хопчыкаў (юнакоў) у камплект могуць уваходзіць пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі і доўгімі рукавамі, гальштук. У зімовы час у камплект могуць уваходзіць трыкатажны світар ці камізэлька.*

*Для дзяўчынак — пінжак, камізэлька, спадніца, штаны, блуза з кароткімі ці доўгімі рукавамі, сарафан. У зімовы час у камплект могуць уваходзіць таксама трыкатажны світар ці камізэлька». Адзенне дзелавога стылю можа быць пашыта з тканін рознай структуры: шэрсці, паўшэрсці, баваўны ці камбінаваных тканін. У вучэбны час не дапускаецца нашэнне адзення з джынсавых тканін. Адзенне можа быць выканана ў рознай каляровай гаме, уключаць элементы з тканін у клетку, але не быць стракатым і занадта яркім».*





Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.





Калекцыя школьнага адзення 2008 года.

# І ЗАРАБІЦЬ, І АДПАЧЫЦЬ

Працоўнае лета-2008

## змогуць сёлета беларускія студэнты ў Расіі

**Летнія месяцы беларуская моладзь праводзіць з карысцю. Па традыцыі з чэрвеня па жнівень самыя актыўныя і ініцыятыўныя могуць паспрабаваць свае сілы ў валанцёрскіх і педагагічных лагерах, на будаўніцтве сацыяльна значных аб'ектаў. Пытаннямі занятасці моладзі ў летні і вольны ад заняткаў час асабліва актыўна займаецца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Прычым з дапамогай найбуйнейшай маладзёжнай арганізацыі ў юнакоў і дзяўчат ёсць магчымасць папрацаваць не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў краінах-суседках, у прыватнасці, у Расіі.**

Як сказаў нам **сакратар ЦК БРСМ Максім БОРД**, сёлета ўжо заключаны дагаворы на работу беларускіх студатрадаў у Расіі і вызначаны канкрэтныя аб'екты, на якіх яны будуць працаваць.

— Першыя атрады ўжо накіраваліся на месца працы. У прыватнасці, сёлета беларускую моладзь чакаюць у Рэспубліцы Комі і Ямала-Ненецкай акрузе: там больш работы для юнакоў (будаўніцтва дарог, тратуараў, укладка пліткі і г.д.). У дзяўчат жа ёсць магчымасць папрацаваць у якасці важатых у дзіцячых лагерах і на базах адпачынку Краснадарскага краю (220 студэнтаў будуць працаваць у педагагічных атрадах і 40 — у сельскай гаспадарцы, на зборы садавіны). У сталіцу зімовай Алімпіяды 2014 года, горад Сочы, сёлета накіруецца пакуль невялікі атрад: 20—30 чалавек. Затое налета туды паедуць ужо 300—400 маладых людзей з Беларусі.

І гэта толькі тое, што сёння зроблена цэнтралізавана Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. Акрамя таго, як вядома, у кожнай вышэйшай навучальнай установе краіны створаны штабы працоўных спраў, якія займаюцца пытаннямі працаўладкавання юнакоў і дзяўчат у летні і вольны ад вучобы час. Напрыклад, Беларускі педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка ўжо больш за 15 гадоў накіроўвае сваіх студэнтаў у Краснадарскі край, і гэту традыцыю працягваюць пярвічныя арганізацыі маладзёжнага саюза. Як падкрэсліў Максім Борд, галоўнае патрабаванне пры працаўладкаванні маладых людзей за мяжой — належныя ўмовы жыцця і працы. У Расіі ўсе гэтыя патрабаванні выконваюцца. БРСМ дае стабільныя гарантыі.

Арганізацыя займаецца ўсімі падрыхтоўчымі і юрыдычнымі пытаннямі. «Маладым людзям гарантаваны належныя ўмовы працы і жыцця, агавораны пытанні харчавання», — адзначае Максім Борд. Паводле яго слоў, сёння маладзёжны саюз можа накіроўваць беларускую моладзь у многія краіны, дзе ёсць патрэба ў рабочай сіле. «Але на гэта мы пакуль не ідзём, кажа М. Борд, бо складана паўсюль гарантаваць належныя ўмовы працы, пражывання, харчавання. Таму з улікам назапашанага вопыту накіроўваем атрады ў краіны-суседкі».

Не менш важкі адрэзак работы і ў тых актывістаў маладзёжнага саюза, якія будуць працаваць у Беларусі. Напрыклад, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт ужо пачаў працоўны семестр. І ўжо сёння студэнцкі будаўнічы атрад універсітэта (а гэта 40 чалавек) працуе на ўзвядзенні першага ў краіне гольф-клуба ў Калодзішчах.

Будаўнічыя, сэрвісныя, валанцёрскія, педагагічныя, сельгасатрады гэтым летам гатовыя прыняць аб'екты Магілёва і Магілёўскай вобласці.

Сёлета, як і заўсёды, будатрады акажуць дапамогу сельскай гаспадарцы. У кожным аграгарадку летам будзе працаваць як мінімум адзін студэнцкі атрад. Хопіць работы ўсім ахвотнікам і ў сталіцы. Маладыя людзі зоймуцца добраўпарадкаваннем тэрыторый, дапамогуць на будаўніцтве жылых дамоў і культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна». Дарэчы, усяго сёлетнім летам будзе арганізавана каля 840 студэнцкіх будоўляў — гэта рэкордная колькасць для краіны (летась было 637 аб'ектаў).

Вядома, за работу ў студатрадах маладыя людзі атрымліваюць грошы. І, па сённяшнім дні, неблагія. Аднак самае галоўнае, што кожны з іх набывае новых сяброў і мае магчымасць паказаць, на што ён здольны. Як паказвае практыка, тыя, хто аднойчы паўдзельнічаў у студатрадаўскім руху, яшчэ доўга застаюцца вернымі яму. Людзі старэйшага пакалення, так бы мовіць, ветэраны студатрадаўскага руху, з асаблівай цеплынёй узгадваюць сваю маладосць і працу на будоўлях. А былі ж яшчэ і цікавыя сустрэчы, і песні пад гітару ля вогнішча. Сённяшняя моладзь таксама можа з карысцю правесці канікулы. Трэба толькі вызначыцца, дзе і кім працаваць.

Да таго ж, па традыцыі, па выніках працоўнага семестра будуць вызначаны лепшыя студэнцкія атрады, якія атрымаюць каштоўныя прызы і падарункі.

**Святлана СУХАРКО.**

## ДАРЭЧЫ...

*На самых вялікіх будоўлях Расіі сёлета будуць працаваць некалькі студэнцкіх атрадаў Гомельшчыны.*

*На работу ўжо выехаў першы будатрад, сфарміраваны са студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту (БДУТ). У найбліжэйшыя дні 20 студэнтаў прыступяць да работ на будаўніцтве аўтамагістралі «Амур». Аўтамабільная дарога федэральнага значэння Чыта — Хабараўск з'яўляецца складнікам транспартнага калідора Парыж — Берлін — Масква — Уладзівасток.*

*Яшчэ адзін атрад з гэтай навучальнай установы з 15 чэрвеня пачне працоўную акцыю ў Падмаскоўі на вытворча-лагістычным комплексе «Паўночнае Дамадзедава». Гомельскія студэнты будуць знаходзіцца тут каля двух месяцаў. Будатрады абласнога камітэта БРСМ, паводле слоў камісара абласнога штаба студэнцкіх атрадаў маладзёжнай арганізацыі Аляксандра Балсуноўскага, традыцыйна будуць працаваць на аб'ектах Краснадарскага края Расійскай Федэрацыі. У прыватнасці, сэрвісныя атрады адправяцца ва ўсерасійскі дзіцячы цэнтр «Арляня» (Туапсэ) і іншыя падобныя аб'екты.*

*Асноўная колькасць студэнцкіх атрадаў вобласці (а гэта будаўнічыя, сельскагаспадарчыя, педагагічныя, экалагічныя) адправяцца працаваць на розныя аб'екты рэгіёна, краіны і за яе межы ў ліпені, пасля заканчэння экзаменаў.*

Надзённае

# ПІЦЕ, ДЗЕЦІ, МАЛАКО

**У мінскай сярэдняй школе № 163 былі падведзены вынікі партнёрскага праекта «Здаровае харчаванне дзяцей — школьнае малако». Ён быў рэалізаваны пры актыўным удзеле члена нацыянальнай сеткі так званага Глабальнага дагавора ў Беларусі кампаніі «Савушкін прадукт».**

Гэты праект з'яўляецца часткай міжнароднай праграмы «Школьнае малако», якая рэалізуецца ў многіх краінах свету. Яна, дарэчы, падтрымліваецца Урадам Беларусі. У ролі партнёраў праграмы выступілі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама, кафедра педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, адміністрацыя Першамайскага раёна сталіцы, міжнародныя арганізацыі, у прыватнасці, Праграма развіцця ААН (ПРААН) і Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ).

Мэта праекта — палепшыць здароўе дзяцей праз змены ў структуры іх харчавання, у тым ліку за кошт больш шырокага выкарыстання ў меню малочных прадуктаў, павышэння ўзроўню ведаў дзяцей і іх бацькоў аб здаровай ежы. З гэтай нагоды кампанія «Савушкін прадукт» дзесяць месяцаў штодзень пастаўляла мінскай школе № 163 бясплатна спецыяльна выпушчаную малочную прадукцыю «Монцік». У школе праводзіліся рэгулярныя сустрэчы з вучнямі і бацькамі, дзе гаварылася аб рацыянальным харчаванні. Таксама была выдадзена брашура «Харчаванне і здароўе дзяцей». На працягу дзесяці месяцаў навукоўцы медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі разам з педыятрамі раённай паліклінікі назіралі за станам здароўя дзяцей.

Дарэчы, сёння ўжо 40 беларускіх кампаній далучыліся да Глабальнага дагавора.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# СПАРТЫЎНЫ КУТОК — У АГРАГАРАДОК

**Абласны маладзёжны праект «У кожны аграгарадок — спартыўны куток» стартаваў на Міншчыне. Яго арганізавалі ў межах 45-годдзя Беларускага студэнцкага атрада Мінскі абласны камітэт БРСМ, упраўленні па фізічнай культуры, спорце і турызме і па ідэалагічнай рабоце Мінаблвыканкама.**

Такім чынам арганізатары імкнуцца прыцягнуць моладзь да добраўпарадкавання аграгарадкоў. Да ўдзелу запрашаюцца маладзёжныя валанцёрскія атрады з раённых цэнтраў сталічнай вобласці.

Акцыя пачалася 1 чэрвеня і пройдзе ў два этапы: да першага верасня мясцовыя аргкамітэты вызначаюць пераможцаў і прадстаўляюць журы фота-і відэаматэрыялы. На другім этапе да 15 верасня абласное журы вызначыць лепшую спартыўную пляцоўку, гульнявую пляцоўку, арганізацыю, якая аказала садзейнічанне ў рэалізацыі праекта, лепшую ў гэтым накірунку агітацыйную работу сярод насельніцтва.

Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца падчас урачыстасцяў штогадовага маладзёжнага форуму «Маладзёжны Алімп Міншчыны», куды з'язджаюцца лепшыя раённыя арганізацыі і клубныя фарміраванні. Пераможцы атрымаюць граматы, каштоўныя падарункі і спецыяльныя прызы.

**Алена КРАВЕЦ.**



**У Глыбоцкім раёне стартаваў праект пад назвай «Чацвёртая вышыня», арганізатарамі якога выступілі раённы аддзел адукацыі і райкам БРСМ. Яго ўдзельнікам — усім разам — на працягу амаль года трэба будзе стаць адзінай дружнай камандай, здольнай прыйсці на выручку кожнаму са сваіх членаў, а кожнаму паасобку — яшчэ і «ўзяць» пэўную ўласную жыццёвую «вышыню», г.зн. нешта зразумець, чагосьці якасна новага дасягнуць у сваім узросце. Усё гэта датычыцца гульні, але ў больш шырокім сэнсе — уласна самога жыцця, стасункаў з навакольнымі, грамадства і праяўлення ўласнай актыўнай грамадзянскай пазіцыі.**

— Назву праекту дала некалі ў дзяцінстве прачытаная мной аднайменная кніга, гераіня якой Гуля Каралёва пакрысе праходзіць пэўныя прыступкі свайго жыцця, з кожнай новай з іх дабіваючыся нечага новага, пазнаючы свет і сябе, дабіваючыся ўрэшце нейкай вызначанай у гэтым сэнсе вышыні, — тлумачыць першы сакратар Глыбоцкага райкама БРСМ Людміла Чэбан. — Адпаведна ва ўсіх камандах пабудаваны і лагічны ланцужок удзельнікаў: акцябраты, піянеры, члены БРСМ, а ўзначальваюць іх настаўнікі, педагогі.

# УЗЯЦЬ СВАЮ ЖЫЦЦЁВУЮ ВЫШЫНЮ



Усяго ў праекце ўдзельнічаюць 10 камандаў, у кожнай адзін акцябронак, па тры піянеры і члены БРСМ і камандзір-педагог.

— Яшчэ адна з мэтаў праекта: узняць прэстыж прафесіі настаўніка, — працягвае Людміла Сцяпанаўна, якая сама мае педагагічную адукацыю. — Камандзіры — настаўнікі не толькі па адукацыі, гэта маладыя спецыялісты, якія прыйшлі ў прафесію па прызванні, а яшчэ ў больш шырокім сэнсе — неабыякавая частка моладзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, лідары, здольныя весці за сабой іншых. Яны павінны выхоўваць сваім прыкладам, што мы і паспрабуем замацаваць падчас праекта.

Самым малодшым удзельнікам — акцябратам — па 7—9 гадоў. Назіраючы за сваімі старэйшымі сябрамі (піянерамі ва ўзросце да 14 гадоў), адчуваючы іх падтрымку, узаемадзейнічаючы разам падчас гульні, яны — па задуме арганізатараў — павінны ўсвядомлена прыняць рашэнне аб уступленні ў піянерскую арганізацыю — узяць сваю першую жыццёвую вышыню. Піянеры гэтаксама павінны зрабіць высновы аб уступленні ў БРСМ, калі ў іх на вачах будзе прыклад канкрэтных старэйшых сяброў, якія ўжо з'яўляюцца членамі гэтай арганізацыі. У далейшым, магчыма, нехта з іх зробіць выбар і на карысць прафесіі настаўніка-лідара (па адукацыі ці па грамадзянскай пазіцыі). А ўсе разам удзельнікі праекта павінны імкнуцца да вышэйшай жыццёвай вышыні — быць патрыётам сваёй Радзімы. І тут, напэўна, не мае значэння, з якога канкрэтнага ўзросту пачнуцца першыя крокі маладога чалавека да гэтай прыступкі ў жыцці, галоўнае, каб яны былі зроблены.

Праўда, тут ёсць і адзін невялікі сакрэт, які мае педагагічнае, выхаваўча-культурнае значэнне: у кожнай камандзе ёсць па два падлеткі, якім рэкамендацыі для ўступлення ў маладзёжныя арганізацыі па завяршэнні праекта павінны даць самі каманды — вартыя яны таго ці не, падрыхтаваныя ці не да такога кроку, іншымі словамі, гэтым падлеткам трэба прайсці пэўны жыццёвы экзамен — таксама ўзяць сваю вышыню.

Людміла Чэбан гаворыць, што калектывізм, узаемавыручка паміж малодшымі і старэйшымі членамі камандаў праявілася ўжо на першым этапе. Ён прайшоў на беразе возера Белае, дзе каманды прадстаўлялі ўласныя візітоўкі і кожнаму члену трэба было паказаць уласны творчы патэнцыял: паказаць сцэнку, прачытаць верш, скласці гімн каманды. Назвы для камандаў выбіраліся самыя розныя — «Сузор», «Дружная сямейка», «Полымя», «СССР» і іншыя.

Усяго будзе 12 этапаў. Наступны адбудзецца ў жніўні, але рыхтавацца да яго ўдзельнікі будуць на працягу чэрвеня—ліпеня. Раней у горадзе была пасаджана Алея дружбы, дубкі ўжо падраслі. Дык вось гэтае месца будзе падзелена на 10 участкаў — па колькасці камандаў. Апошнім трэба будзе ўпрыгожыць іх на свой густ, згодна з выпрацаванай канцэпцыяй, малымі архітэктурнымі формамі, установіць дэкаратыўныя агароджы і г.д. Адначасова пройдзе фотасесія ўдзельнікаў праекта, асобныя конкурсы. Па выніках кожнага этапа камандзір каманды-пераможцы атрымлівае адпаведны тытул, удзельнікам уручаюцца прызы. Галоўны суперпрыз па выніках усяго праекта пакуль трымаецца ў сакрэце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Уладзіслава БАРЫЛЫ.**

Захапленні

# «МЫ НЕ ГАНЯЕМ!..»

Шчыра кажучы, паняцце Racing для Беларусі незвычайнае і мала знаёмае. Пыльная дарога, шчыльны паток машын і спякотнае надвор'е... Перад вачыма, хутчэй, паўстаюць пейзажы Амерыкі, чым нашай краіны. Але, як ні дзіўна, з кожным годам гэты спецыфічны від спорту актыўна набірае абароты ў Беларусі і ўражвае сваёй маштабнасцю і цікавасцю да яго.

Пачынаючы гаварыць аб драгрэйсінгу, трэба звярнуцца да гісторыі і зразумець асноўнае — што гэта такое?

А справа ў тым, што на мяжы XX—XXI стагоддзяў эпідэмія двух незразумелых слоў Dragrace і Streetrace ахапіла ўвесь свет! Хтосьці кажа проста «drag», іншыя — «street», трэція — так і гэтак...

Але ўсё ж такі трэба размяжоўваць гэтыя два паняцці. Першае азначае легальныя шматэтапныя гонкі на класічных дыстанцыях «чвэрць мілі» (альбо 1/8 ці 1/2), якія праходзяць пад кантролем спартыўных арганізацый. Другое — нелегальнае, для энтузіястаў, якія ганяюць на адносна ціхіх гарадскіх ці прыгарадных вуліцах.

Трэба зазначыць, што нарадзіліся гонкі ў Злучаных Штатах. У другой палове 40-х гадоў мінулага стагоддзя менавіта там узнікла новае захапленне — гонкі на аўтамабілях з месца па прамой. Сцэнарый спаборніцтваў, хутчэй за ўсё, склаўся з асаблівасцяў нацыянальнага характару амерыканцаў, памножаных на спецыфіку мясцовага машынабудавання.

Класічная дэталь — «чвэрць мілі» — з'явілася пазней. Спярша ганялі на любым падыходзячым месцы на дарозе, далей ад вачэй паліцыі. Затым ініцыятыўныя людзі вырашылі як-небудзь упарадкаваць стыхійны занятак і вылічылі, што аптымальным для развіцця добрай хуткасці з'яўляецца чвэрць мілі.

У 1948 годзе адбылася вельмі важная падзея: у штаце Каліфорнія пачала працаваць першая спецыяльная траса для Dragrace. Пачаўся імклівы рост папулярнасці гэтага віду спорту, які ў выніку прывёў да таго, што ў Амерыцы



ўзнікла ўнікальная культура будавання «гарачых» машын. Гэткія монстры, зробленыя выключна для гонак на чвэрць мілі, заслугоўваюць асаблівай увагі!

Паступова з дваровых гонак вырасла цэлая індустрыя. Сёння ў Dragrace існуюць шмат класаў. Дзяленне адбываецца па тыпу кузава, аб'ёму рухавіка і нават віду паліва. Вельмі часта ў рамках фестывалю праводзяцца аналагічныя заезды на матацыклах.

Амерыканскія Dragrace — цэлая падзея, якая збірае шматтысячную аўдыторыю фанатаў. Трыбуны цягнуцца на працягу ўсёй трасы.

Цікава і тое, што перад заездам камандам даецца час на прагрэў гумы. Гэта таксама частка «культурнай праграмы» — глядзець, як, узрываючы паветра дзікім ровам, машыны паліруюць дарогу вялізнымі заднімі коламі. Затым аўтамабілі высоўваюцца да лініі старту, дзе іх чакае святлафор — такі ж, як і на дарогах. Чырвоны, жоўты, зялёны... Трыбуны, застыўшы ў чаканні, з першымі секундамі старту любімых камандаў узрываюцца...

Трэба сказаць, што і мы нічым не горшыя за амерыканскіх калег! І, як прыклад, можна прывесці мінулы выхадны дзень, 7 чэрвеня. Менавіта ў гэты дзень у горадзе Бабруйску, на мясцовым аэрадроме, прайшоў чарговы этап чэмпіянату Беларусі па драгрэйсінгу. Ён прайшоў у аднадзённым фармаце, у чатырох класах: да 1800 куб.см, 1801—3200 куб.см, 3201—4200 куб.см і клас Unlimited. Гэта мерапрыемства было цікавае і таму, што сёлета дзейнічала новая сістэма судзейства па цюнінгу. Калі раней лепшую машыну выбірала журы, то ў гэты раз спаборніцтвы наблізіліся да максімальна народных, аб'ектыўных і зразумелых. Кожны госць атрымаў магчымасць прагаласаваць за тую машыну, якая спадабалася больш за ўсё! У выніку, 1-е месца ў класе Unlimited атрымаў Дзмітрый Нагула з Гродна на аўтамабілі VW Golf 2.2 turbo. Госць з суседняй Літвы — Эдмунд Савіцкі на Audi 90 — заняў першае меца ў класе FSC.

Увогуле, акрамя вось такіх этапаў, на тэрыторыі Беларусі існуе і спецыяльны клуб па драгрэйсінгу. Каманда Racing.by была створана ў сярэдзіне 2003 года групай моладзі, якую цікавілі нелегальныя начныя гонкі, што няспынна набіралі абароты ў той час. Першапачаткова асноўнай мэтай клуба стала аб'яднанне ўсіх камандаў, якія арганізоўваюць начныя гонкі. Пасля, у жніўні 2003 года, быў праведзены першы фестываль пад Мінскам. Што і казаць, шмат чаго змянілася з таго часу, змяніўся склад удзельнікаў. Некаторы час быў такі перыяд, калі клуб увогуле не працаваў, але прыемна, што ўсё ж такі атрымаў другое дыханне ў канцы 2004 года.

Наіко (Айк Сіманян) і Hijack (Нікіцін), абмеркаваўшы стан аўтаспорту, вырашылі стварыць Інтэрнэт-рэсурс www.racing.by, які стартаваў 31 студзеня 2005 года.

Той год быў поўны новых ідэй і магчымасцяў для іх рэалізацыі. У красавіку 2005 года былі праведзены першыя VIP402, пазней з'явіліся такія віды гонак, як 7cat, O2, Страла, Шашкі. Гэтыя гонкі былі вельмі папулярнымі, на іх збіралася паглядзець тысячы (!) наведвальнікаў, але яны тады ўсё ж былі нелегальнымі. Таму лагічным працягам развіцця аўтаспорту была легалізацыя гонак, выхад на новы ўзровень.

Было вырашана ў сезоне 2006 года ўпершыню ў гісторыі беларускага драгрэйсінга правесці чэмпіянат краіны. Вельмі важным момантам з'яўляецца і тое, што на першым чэмпіянаце ўпершыню ва ўсім беларускім аўтаспорце быў створаны прызавы фонд, прычым крыніцамі фінансавання былі не самі ўдзельнікі, як раней, а афіцыйныя рэкламадаўцы!

Першы этап быў праведзены 27 мая 2006 года ў горадзе Бабруйску. Упершыню ўдзельнічалі прадстаўнікі замежных краін. Другі этап паспяхова прайшоў 21 кастрычніка 2006 года. Тым самым удалося правесці афіцыйны чэмпіянат Беларусі.

Але драгрэйсінг — гэта не толькі адзін з напрамкаў аўтаспорту, каманда racing.by мае шмат ідэй для развіцця і іншых відаў спорту, такіх як кальцавыя гонкі, хуткаснае манеўраванне. На правядзенне такіх мерапрыемстваў патрабуецца падтрымка мясцовых уладаў, напрыклад, прыняць сур'ёзнае рашэнне па перакрыцці некаторай часткі дарогі.

На гэты момант каманда Racing.by складаецца больш чым з 12 чалавек. Але гэта не мяжа! Клуб з радасцю чакае новых ахвотнікаў і аматараў экстрэмальнага драгрэйсінга! І чамусьці не пакідае пачуццё таго, што гэта — пачатак чагосьці новага і незвычайнага! Пагналі!

**Дзіяна АРЫПАВА.**

Быць здаровымі

# Ад школьнай Спартакіяды да Алімпіяды

**14 чэрвеня а 14-й гадзіне на цэнтральным стадыёне Гомеля, хатняй арэне мясцовага футбольнага клуба, адбудзецца афіцыйная цырымонія адкрыцця фінальнага этапа III Рэспубліканскай спартакіяды школьнікаў.**

Спаборніцтвы па 22 відах спорту пройдуць на розных спартыўных арэнах Гомельшчыны — у самім абласным цэнтры, Жлобіне, Рэчыцы, Мазыры, Лельчыцах. Сачыць за ходам Спартакіяды будзе галоўны суддзя, алімпійскі чэмпіён па веславанні на байдарках і каноэ Мікалай Гарбачоў. Лепшых спартсменаў узнагародзяць медалямі, кубкамі, дыпломамі, памятнымі падарункамі.

Паводле слоў Сяргея Шаблыкі, дырэктара Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў, асаблівасцю Спартакіяды стане яе алімпійскі ўхіл. «Сёлетняя Спартакіяда яшчэ і папярэднічае Гульням у Пекіне, — кажа Сяргей Іванавіч. — На цырымоніі адкрыцця нашай Спартакіяды будуць узнятыя дзяржаўны сцяг і сцяг Нацыянальнага алімпійскага камітэта, запалены алімпійскі агонь, а значыць, удзельнікі далучацца да духу алімпізму».

Сяргей Шаблыка адвёў Спартакіядзе важную ролю ў падрыхтоўцы спартыўнага рэзерву Беларусі, бо без удзелу ў спаборніцтвах ад школьнай парты вынікі нашых спартсменаў на міжнароднай арэне не былі б настолькі высокімі. Напрыклад, у мінулым годзе беларускія юніёры заваявалі на турнірах 118 медалёў па алімпійскіх відах спорту. Гэта дазволіла заняць у юніёрскім спорце 14-е месца па летняй праграме і 12-е па зімовай. А юніёры, зразумела, — гэта будучыня беларускай зборнай, якой змагацца за пападанне ў спіс наймацнейшых дзяржаў на Алімпійскіх гульнях.

Начальнік упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Віктар Якжык нагадаў, што першая Спартакіяда была два гады таму ў Брэсце, а далей гаспадары спаборніцтваў вызначаюцца ў алфавітным парадку — Віцебск, Гомель, Гродна... У Спартакіядзе звычайна бярэ ўдзел звыш 23 працэнтаў ад агульнай колькасці беларускіх школьнікаў. Цырымонія закрыцця сёлетніх спаборніцтваў запланавана на 20 чэрвеня

**Ірына ПРЫМАК.**

Муз-news

## РЫБКІ І ТАНЦЫ ІСКУІ АБАЛЯН

**Спявачка запісала і выпусціла ў «плаванне» па радыёэфірах адразу дзве новыя кампазіцыі. Адна з іх, «Танцы байцовых рыбак», ужо вядомая слухачам па канцэртах, затое другая — «Дыска і джаZ» — прэм'ерная. Дакладней, зроблена яна была яшчэ да лютаўскага праекта Іскуі «Каханне кіруе светам», але сапраўднае жыццё набыла толькі цяпер.**

Паводле слоў самой спявачкі, ёй падабаюцца абедзве песні. «Рыбкі» — таму, што кампазіцыя атрымалася вельмі глыбокай па змесце і ўвасабленні, «Дыска і джаZ» — таму, што перадае лёгкасць і добры летні настрой. Да таго ж на апошнюю песню разам з балетам «Прайд» у Іскуі Абалян гатовы надзвычай прыгожы нумар. А ў калекцыі прыхільнікаў і тая, і другая песня з'явяцца, хутчэй за ўсё, у наступным годзе. Менавіта на гэты час намечана выданне новага альбома спявачкі, куды будуць уключаныя гэтыя песні.

## «МУЛЬЦІК» У ПАПЯРОВАЙ ВОКЛАДЦЫ

**9 чэрвеня ў Мінску быў прэзентаваны музычны зборнік «Папяровы рай» — кампіляцыя песень беларускіх артыстаў. Выканаўцы сабраліся самыя розныя — ад вядомага педагога па вакалу Вольгі Вронскай да сёлетняга канкурсанта на «Славянскім базары» Віталя Гардзея, ад танклявай прыгажуні Веры Карэтнікавай да брутальнага Уладзіміра Ухцінскага. Аб'ядноўвае іх... аўтарства песень, якія напісаў творчы тандэм Святаслава Пазняка і Наталлі Ладыгінай.**

Адно з цэнтральных месцаў у кампіляцыі займае песня Ларысы Грыбалёвай «Мульцік». Прычым, як расказала сама спявачка, нічога мульцяшнага ў філасофскім тэксце няма. «Сэнс песні — з намёкам на тое, што ў жыцці проста так нічога не бывае і з неба не падае. А вось аранжыроўка спецыфічная, як быццам з мульціка. Таму ў маёй галаве тут жа намаляваўся відэарад — намаляваныя пейзажы, мульцяшныя героі нашага горада, — узгадвае Ларыса. — Аднак калі мы палічылі, колькі гэта будзе каштаваць, адклалі здымкі кліпа да лепшых часоў. А назва «Мульцік» за песняй так і замацавалася».

Што да іншых частак «Папяровага раю», то большасць песень, як водзіцца, пра каханне: «Непрыдуманае каханне», «Позняе каханне» і нават «Малекулы кахання». Усяго ў зборнік увайшлі 12 кампазіцый, у тым ліку адна інструментальная п'еса і адна караоке-версія — загалоўнай песні «Папяровы рай», якую выконвае Вера Карэтнікава. Удзельнікі зборніка прадставілі вынік сваёй работы ў адным са сталічных клубаў, а пасля з сур'ёзным выглядам урачыста паабяцалі «выдаць дыск накладам у 150 тысяч асобнікаў і паехаць у гастролі па Беларусі і блізкім замежжы».

**Вядучая рубрыкі**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Выпрабавана на сабе

# ЭЛЕКТРОННЫ ГАНДАЛЬ: ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ АШУКАНЦАЎ?

**У апошні час у Інтэрнэце з'явілася вялізная колькасць ашуканцаў, якія спрабуюць «усунуць» наіўным пакупнікам падробленыя тавары. На асабістым прыкладзе ўпэўніўся ў тым, што і ў нас у краіне існуюць Інтэрнэт-крамы, у якіх спрабуюць прадаць няякасны прадукт.**

Трэба было тэрмінова купіць мабільны тэлефон. Месца куплі не давялося доўга выбіраць. Гэта была адна са шматлікіх крамаў, размешчаных у «сусветнай павуціне». Да таго ж гэта была не першая мая пакупка, набытая праз Інтэрнэт. Да гэтага такім спосабам я ўжо купляў сабе лічбавы фотаапарат, дыктафон, ноўтбук, сканар, ксеракс... Вопыт, як бачна, ужо быў. Радуе, што заўсёды мне трапляліся сумленныя і адказныя прадаўцы, якія не спрабавалі «ўсунуць» няякасны тавар. Але гэта было да пары да часу.

Такім чынам, мне трэба купіць мабільны тэлефон. Як звычайна, заходжу ў Інтэрнэт, шукаю крамы, выбіраю патрэбны мне тавар. Самае галоўнае ў такіх выпадках памятаць, што не трэба спыняцца на першай жа прапанове. Справа ў тым, што кошты ў Інтэрнэт-крамах, у прынцыпе, як і ў звычайных, могуць вагацца, і розніца часам даходзіць да сотні і больш долараў.

Гэта залежыць ад таго, што вы збіраецеся купляць. Калі дарагую рэч, то і розніца можа быць значнай. Не спяшаюся рабіць куплю. У мяне ўжо вялікі вопыт пакупак праз Інтэрнэт, таму даволі-ткі хутка знайшоў патрэбны мне тавар. І кошт задаволіў, і мадэль. Паглядзеў асноўныя характарыстыкі. Потым патэлефанаваў у фірму, зрабіў замову. Тэлефон мне прывезлі дахаты, абсалютна бясплатна. Замову я зрабіў раніцай, а тавар прывезлі праз некалькі гадзін. Усё вельмі аператыўна. Мне паказалі тэлефон, падпісалі гарантыйны талон. Праўда, я не змог уключыць тэлефон. Прадавец сказаў, што такія мадэлі прадаюцца з незараджанымі батарэямі. Для зарадкі трэба не менш за пяць гадзін. Я падумаў, што нічога страшнага ў гэтым няма, пазней усё зраблю. Самае галоўнае, што ніякіх механічных пашкоджанняў не было. Заплаціў грошы, і мы развіталіся.

Самае цікавае адбылося пасля зарадкі. Як аказалася, мой новы тэлефон «глючыць» па поўнай праграме: перыядычна сам выключаецца, фота не працуе, пастаянна «завісае»... Вядома, паўстала пытанне з нагоды абмену няякаснага тавару. Тэлефаную ў фірму, але чамусьці ніхто не адказваў. І што самае цікавае, калі я патэлефанаваў з іншага нумара, то трубку адразу ж паднялі. Я зразумеў, што размаўляць са мной не будуць, калі я адразу ж скажу, што ў іх няякасны прадукт. Таму вырашыў схітраваць.

— Добры дзень, скажыце, калі ласка, ці ёсць у вас тэлефон такой вось мадэлі?

— Ёсць.

— А колькі ён у вас каштуе?

— 256 долараў.

— Скажыце, а ў вас якасны тавар? Проста купляў у адной фірме тэлефон, а ён аказаўся нерабочым...

— Не-не, у нас усё з гэтым у парадку. Яшчэ не было выпадкаў звароту...

— Ага, да сённяшняга дня. Справа ў тым, што я ў вас купіў мабільны тэлефон, а ён аказаўся няспраўным. Што мне рабіць?

— Вам трэба схадзіць у сэрвісны цэнтр, каб яго там пратэставалі. Потым будзем глядзець на заключэнне...

На наступны дзень пайшоў у сэрвісны цэнтр. Сказалі пакінуць тэлефон і прыйсці праз тры дні. Заключэнне адмыслоўца было наступным: тэлефон падлягае абмену. Былі адзначаны няспраўнасці. Зноў тэлефаную на фірму. Як і ў першы раз ніхто не адказвае. Што рабіць? Вырашыў з'ездзіць на саму фірму, у офіс. Нарэшце мне адказвае маладзіца на мой тэлефонны званок, кажу, што ёсць пацвярджэнне таго, што тавар падлягае абмену, на што тая гаворыць, што перэтэлефануе. Паспяваю спытаць, які ў іх адрас, дзе іх офіс. Адказваць яна не стала, сказала, што мяне гэта не павінна цікавіць і паклала трубку. Праз некалькі хвілін тэлефаную зноў, але ніхто не адказвае.

Як аказалася, у гарантыйным талоне не быў пазначаны адрас фірмы. Давялося вельмі моцна пастарацца, каб знайсці месца размяшчэння гэтай «фількавай» канторы. Дапамог Інтэрнэт.

Такім чынам, я стаю перад домам, дзе нібыта знаходзіцца офіс фірмы. Тэлефаную, кажу, што стаю пад будынкам. Маладзіца адказвае, што сёння кур'ер прывязе мне новы тэлефон. Назвала мне адрас і час сустрэчы.

У вызначаны час мне прывезлі тэлефон на замену. Гэтым разам я больш уважліва агледзеў куплю. Гэты тэлефон аказаўся зараджаным, у адрозненне ад першага. У гэты раз я быў задаволены сваёй пакупкай. Думаю, што ў падобную сітуацыю могуць патрапіць многія. Ад гэтага ніхто не застрахаваны. Але як застрахаваць сябе ад ашуканцаў, якія хочуць «сплавіць» няякасны тавар.

**ЯК НЕ ПАТРАПІЦЬ ДА АШУКАНЦАЎ?**

Эксперты адной амерыканскай кампаніі па даследаваннях распавядаюць аб тым, як можна не патрапіць у рукі гэтых ашуканцаў. Ніхто не стане спрачацца з тым, што электронны гандаль у нашы дні перажывае сапраўдны росквіт.

Паводле даных адной з кансалтынгавых кампаній, летась тыя або іншыя тавары праз Інтэрнэт набылі прыкладна 50 працэнтаў амерыканцаў. На жаль, 10 працэнтаў людзей з гэтага ліку не пашанцавала: яны сталі ахвярамі ашуканцаў, купіўшы замест сапраўдных тавараў падробкі. Злачынцы падрабляюць практычна ўсе віды тавараў, і гэтыя падробкі шырока прадаюцца праз сетку Інтэрнэт.

У апошні час аб'ёмы вытворчасці падробак значна ўзраслі. Гэты працэс абумоўлены агульным падаражэннем, напрыклад, выдаткаў на лячэнне, у выніку якога пацыенты вымушаны адшукваць для сябе таннейшыя альтэрнатывы «афіцыйным» лекам. Цікава, што седзячы за маніторам і разглядаючы малюнак тавару на сайце электроннай крамы, вельмі складана вызначыць, падробка гэта або не. Мы не можам проста ўзяць гэтую рэч у рукі і добра агледзець. Тым не менш, не варта думаць, што кліент электроннай крамы цалкам безабаронны перад тварам ашуканцаў.

Ніжэй мы прапаноўваем вашай увазе 10 парад, якія павінны дапамагчы вам пры наведванні электронных крамаў, адрозніць сапраўдныя тавары ад падробак.

**ПАРАДЫ**

**1.** Калі кошт на той або іншы тавар падаецца вам вельмі нізкім, то, хутчэй за ўсё, вам спрабуюць прадаць падробку.

На жаль, некаторыя тавары проста не могуць каштаваць настолькі танна, як бы нам гэтага хацелася. Калі ж тавар з «дарагім» брэндам прапаноўваецца занадта танна, а прадавец пры гэтым яшчэ спрабуе заахвоціць вас да максімальна хуткага здзяйснення пакупкі, то, хутчэй за ўсё, вас проста спрабуюць падмануць.

**2.** Заўсёды, калі гэта толькі магчыма, імкніцеся мець справу толькі з кампаніямі, якія маюць добрую рэпутацыю.

Пакупнікам заўсёды варта пачынаць пошук тавараў, якія цікавяць іх, у Сетцы з сайтаў кампаній, у якіх, апроч электронных крамаў, ёсць яшчэ і звычайныя рознічныя гандлёвыя пункты. У гэтым выпадку вы можаце прынесці няякасны тавар у звычайную краму і вярнуць яго. Самае галоўнае, што ў такую краму заўсёды можна звярнуцца па кансультацыю па пытаннях, звязаных з функцыянаваннем электроннай крамы, або проста паскардзіцца там на яго працу.

**3.** Калі вы не знаёмыя з электроннай гандлёвай кампаніяй, паслугамі якой вы збіраецеся скарыстацца, для пачатку паспрабуйце ацаніць узровень яе сайта.

Калі сайт зроблены непрафесійна, на ім нічога не гаворыцца аб магчымасці вярнуць назад дрэнны тавар і атрымаць за яго грошы, на ім няма фізічнага адраса кампаніі-аператара, то трэба падумаць, перад тым як купляць там штосьці. Трэба знайсці на сайце тэлефоны кампаніі і праверыць, ці працуюць нумары тэлефонаў, якія пазначаны.

**4.** Шукайце інфармацыю аб сертыфікатах, якія павінна мець кампанія электроннай крамы.

**5.** Ніколі не купляйце лекі, не атрымаўшы на іх рэцэпт у свайго ўрача. Калі ў электроннай аптэцы вам прапаноўваюць без рэцэпта купіць лекі, на якія неабходны рэцэпт, то, цалкам верагодна, вы маеце справу з ашуканцамі, якія спрабуюць «усунуць» вам падробку. Варта памятаць, што рэцэпт — гэта яшчэ і дадатковая гарантыя таго, што вам сапраўды трэба менавіта тыя або іншыя лекі, а не штосьці больш сур'ёзнае.

**6.** Не саромейцеся задаваць пытанні персаналу электроннай крамы, паводзьце сябе з імі таксама, як і ў звычайным універмагу.

Пакупнікі на электронным аўкцыёне маюць права ведаць, колькі часу рэч, што прапаноўваецца на продаж, знаходзілася ў яе прадаўца. Калі вы збіраецеся набыць штосьці сапраўды каштоўнае, напрыклад, ювелірныя ўпрыгажэнні, то вам варта звярнуцца да прадаўца па копію заключэння ацэншчыка. Калі вы маеце справу з добрасумленным прадаўцом, то, хутчэй за ўсё, такі дакумент будзе ў яго на руках.

**7.** Калі вы купляеце каштоўныя прадметы, то падумайце аб тым, каб перавесці грошы прадаўцу з дапамогай электроннага кашалька.

Гэты сайт, атрымаўшы ад вас плату, прытрымае яе датуль, пакуль вы не атрымаеце набыты вамі тавар на рукі і не пацвердзіце, што гэта менавіта тое, што вы і заказвалі.

**8.** Падрыхтуйцеся перад купляй.

Атрымайце хоць мінімальную інфармацыю аб тым, як павінна выглядаць тая рэч, якую вы збіраецеся набыць. Калі вы набываеце прадметы калекцыянавання, то спачатку наведайце хоць бы пару Інтэрнэт-форумаў, на якіх збіраюцца знатакі гэтых рэчаў, дзе вы зможаце звярнуцца да сапраўдных адмыслоўцаў па кампетэнтную параду.

**9.** Не занадта моцна давярайце разнастайным «сертыфікатам сапраўднасці».

Мноства людзей у нашы дні купляюць праз сетку Інтэрнэт аўтографы знакамітасцяў, імкнучыся, каб жаданы кавалачак паперы суправаджаўся б сертыфікатам, які сведчыць аб тым, што змешчаны на ім подпіс сапраўды пастаўлены тым або іншым вядомым чалавекам.

Разам з тым у большасці выпадкаў гэтыя людзі аддаюць свае грошы за падробкі. Паводле іх слоў, праблема заключаецца ў тым, што ашуканец цалкам можа падрабіць не толькі сам аўтограф, але і сертыфікат на яго. З такімі ж праблемамі можна сутыкнуцца і пры набыцці іншых тавараў.

**10.** Даведайцеся, які рэйтынг мае выбраны вамі прадавец.

З дапамогай службаў Інтэрнэт-пошуку можна па назве або імені прадаўца паспрабаваць знайсці іншую інфармацыю аб ім, якая існуе ў Інтэрнэце. Магчыма, што такія пошукі прывядуць вас на форум, на якім вы зможаце прачытаць расчараваныя рэплікі вашых папярэднікаў, якіх ужо ашукалі.

Самае галоўнае: заўсёды памятайце аб тым, што асцярожнасць і прадбачлівасць пры працы з Інтэрнэт-крамамі ніколі не будуць залішнімі. Купляючы тавары з дапамогай Сеткі можна вельмі лёгка нарвацца на падробку, і, калі вы не будзеце загадзя гатовыя да сустрэчы з ашуканцамі, то вы цалкам можаце стаць іх новай ахвярай.

**НАГАДАЕМ**

У сакавіку мінулага года ў Беларусі ўступалі ў сілу новыя правілы Інтэрнэт-гандлю, паводле якіх гандаль таварамі праз Інтэрнэт у нашай краіне могуць весці толькі Інтэрнэт-крамы, якія зарэгістраваны дзяржаўным цэнтрам бяспекі інфармацыі і маюць нацыянальны дамен. Пастанову ўрад прыняў «у мэтах удасканалення механізму рознічнага гандлю».

Як сказана ў пастанове Саўміна, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі могуць здзяйсняць рознічны гандаль па ўзорах праз Інтэрнэт-крамы (сайты), «якія змяшчаюць адпаведную патрабаванням заканадаўства інфармацыю аб суб'екце гандлю і таварах, размешчаных на серверы на тэрыторыі Беларусі, даменнае імя якіх зарэгістравана ва ўсталяваным парадку ў даменнай адраснай прасторы нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт».

Яшчэ ў 2006 годзе Мінгандлю быў праведзены выбарачны маніторынг Інтэрнэт-крамаў, якія дзейнічаюць у беларускім сектары Інтэрнэта. Была праверана дзейнасць каля 200 сайтаў, размешчаных на найбольш папулярных беларускіх Інтэрнэт-пляцоўках.

Хоць усе такія гандлёвыя прадпрыемствы размяшчаюць на сайтах кантактную і іншую інфармацыю аб сабе, у Міністэрстве гандлю канстатавалі, што па выніках праверак дзейнасці Інтэрнэт-крамаў, а таксама з улікам наяўнай у органах інфармацыі аб парушэннях правоў спажыўцоў пры здзяйсненні электронных пакупак, можна гаварыць аб парушэнні ліцэнзійных нормаў і правілаў гандлю.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Вакол спорту

# РАБІЦЕ ВАШЫ СТАЎКІ, СПАДАРСТВА,

## ці Як зарабіць на Еўра-2008?



**Пакуль футбалісты заваёўваюць (губляюць) ачкі ў матчах групавой стадыі Еўра-2008, іншыя ігракі выйграюць (прайграюць) грошы ў букмекерскіх канторах. Цяжка сказаць, каго болей сярод заўсёднікаў гэтых месцаў, — аматараў спорту ці шукальнікаў лёгкай нажывы. Праўда, павялічыць свой банк у некалькі разоў у залежнасці ад каэфіцыента ўдаецца не ўсім, а толькі самым кемлівым у футбольнай сферы. І ўдачлівым. На фаварытаў каэфіцыенты звычайна невялікія, таму на іх не нажывешся. Большы куш у рызыкоўных, хто паставіў на менш рэйтынгавую зборную, і фартуна не падвяла. Фактар удачы я не пераацэньваю. Узгадайце хоць бы мінулы чэмпіянат кантынента ў Партугаліі, калі аўтсайдары, грэкі, сталі першымі. Ці возьмем нядаўні матч групавога этапа Еўра-2008 Галандыя — Італія. Перакананая, што асноўная частка ігракоў ставіла на чэмпіёнаў свету, а яны, як вядома, былі разгромленыя «аранжавымі».**

**Аб тэхналогіі азарту карэспандэнту «Звязды» расказаў дырэктар букмекерскай канторы «Статус-КВО» Аляксандр Шэльмакоў. Менавіта ён стаяў ля вытокаў стварэння ў нашай краіне букмекерскіх кантор.**

***— Аляксандр Іванавіч, які кантынгент вашых пастаянных кліентаў?***

— За апошні час значна больш стала моладзі. Калі ў 90-я гады мінулага стагоддзя да нас у асноўным прыходзілі валютчыкі, таксісты, то цяпер — студэнты. Лічу, што гэта звязана са змяненнямі сацыяльнага статусу. Сёння студэнты часта ездзяць на шыкоўных аўтамабілях, маюць грошы і на стаўкі. Увогуле кантынгент нашых наведвальнікаў, як шматслойны торт: амаль усе любяць спорт, таму да нас прыходзяць самыя розныя людзі — нават чыноўнікі, святары і жанчыны. Ці ёсць сярод ігракоў вядомыя спартсмены? Магчыма. Стаўкі ж можна рабіць і па Інтэрнэце. Усіх кліентаў ведаць нельга. Ёсць і ігракі, якія ходзяць да нас, як на працу.

***— Чаму наогул людзі становяцца заўсёднікамі букмекерскіх кантор?***

— Мне здаецца, што гэта добры спосаб праверыць свае інтуіцыю і веды ў спорце, такім чынам самавызначыцца.

***— Мінімальны памер стаўкі 2 тысячы беларускіх рублёў. Які быў самы вялікі банк на вашай памяці?***

— У нас занадта многа грошай не ставяць *(задумваецца)*. Быў адзін мільён, два, тры, але нячаста — некалькі разоў на год.

***— А самі не забаўляліся?***

— У мяне проста не было такой магчымасці — я ж сам адкрыў першую букмекерскую кантору ў 1993-м. І цяпер яе дырэктар.

***— Паводле меркавання вядучых букмекерскіх кантор свету, вялікія шанцы стаць чэмпіёнамі Еўропы сёлета ў немцаў. Далей ставяць на італьянцаў, іспанцаў, французаў. Вы такога ж меркавання?***

— Пакуль ідзе групавы этап, у нас пакуль робяць стаўкі менавіта на гэтыя матчы, а хто стане чэмпіёнам, яшчэ не задумваюцца. Асабіста мне хацелася б, каб перамагла Партугалія.

***— Ці ёсць у вас гумарыстычныя, арыгінальныя стаўкі, як напрыклад, у расійскай БК «ФОН» — на мат каментатараў, з'яўленне на полі голых мужыкоў ці жанчын і г.д.***

— Я разумею, аб чым вы. Мы звычайна робім роспіс матча — колькі пенальці, картачак і г.д. А каб такое...

***— Які механізм складання каэфіцыентаў?***

— У нас ёсць спецыяльна абучаныя для гэтага людзі. Пры складанні каэфіцыентаў яны ўлічваюць усё — хто ўдзельнікі і суддзя матча, які склад каманды, надвор'е ў дзень гульні і г.д.

***— Ці магчыма па букмекерскіх каэфіцыентах прадказаць чэмпіёна Еўропы-2008?***

— Гэта наша асабістае меркаванне. Яно можа супадаць ці разыходзіцца з пазіцыяй ігракоў, рэчаіснасцю.

***— Ці шмат беларусаў змаглі ўгадаць, што чэмпіёнам мінулага Еўра стане Грэцыя? Наогул на гэту зборную хтосьці ставіў у нашай краіне?***

— Ведаеце, тады многія канторы разарыліся з-за грэкаў. І мы аказаліся ў крызіснай сітуацыі. На перамогу грэкаў у нас быў каэфіцыент 1:8. У асноўным на будучых чэмпіёнаў Еўропы ставіла... грэчаская дыяспара, якая ў нас жыве. Яны і сарвалі банк.

### Меркаванні экспертаў:

**Мікалай ХАДАСЕВІЧ**, вядучы праграмы «Сталічны футбол» на СТБ:

— Я раней ставіў, але цяпер у мяне няма на гэта часу. У букмекерскую кантору я хадзіў не для таго, каб разбагацець (для гэтага ходзяць і ў казіно), а каб быць у спартыўным тонусе. Улічваючы, што для мяне гэта было падтрымкай спартыўнага інтарэсу, з задавальненнем ставіў на перамогу любімай каманды. Звычайна я аддаваў перавагу экспрэсу (стаўка на некалькі вынікаў розных падзей). Гэта магчымасць падстрахавацца, і там добры выніковы каэфіцыент. Звычайна ставіў 3—10 тысяч у залежнасці ад упэўненасці. Мой максімальны выйгрыш склаў 600 долараў. Гэта было ў час чэмпіянату свету ў Германіі. Ведаю, што ёсць людзі, якія жывуць гэтым. Якія я даў бы парады навічкам? Зручней ставіць праз Інтэрнэт, бо ля букмекерскіх кантор звычайна вялікія чэргі, акрамя таго ў «павуціне» можна хутка знайсці нейкую спартыўную статыстыку. Варта прымяняць аналітычны падыход, але гэта не гарантуе поспех.

**Мікалай ВОЛКАЎ**, спартыўны псіхолаг:

— Сярод нас ёсць людзі, якія вельмі схільныя да гульні. Калі чалавек цалкам ва ўладзе азарту, забывае аб самім спорце, для яго важныя толькі грошы, то гэта ўжо хвароба. Памятаеце «Ігрока» Дастаеўскага? Гэта адхіленне ад нормы. Букмекерскія стаўкі датычацца галоў, ачкоў, секундаў, а ў спорце важна само дзеянне. І запамінаецца ж само імгненне, калі мы радуемся ад гола, перамогі, рэкорду і г.д.

### Калі вырашыце рызыкнуць...

Букмекеры расстаўляюць зборныя па сіле, улічваючы іх рэйтынг, ці ёсць траўмы ў вядучых ігракоў, гісторыю супрацьстаяння камандаў і г.д. Аднак ёсць і іншы сучасны падыход. Як сцвярджае расійскі дзелавы часопіс Smart Money, існуе сувязь паміж поспехам у футболе і... эканомікай, а дакладней з ВУП краіны, якую прадстаўляе зборная. Самы вялікі ВУП у Еўропе ў Германіі, і менавіта немцы больш за астатніх перамагалі на першынстве кантынента. На другім месцы па колькасці перамог — Францыя, чый памер ВУП таксама другі ў Еўропе. Італія і Іспанія выйгравалі Еўра па разу. І ў іх адпаведна трэці і чацвёрты ВУП. Аналітыкі таксама спрагназавалі, хто можа выйсці з групы на сёлетнім турніры. У прыватнасці, расіяне павінны заняць чацвёртае месца.

**Ірына ПРЫМАК.**

## Чэмпіён — Германія?

**Калі вы вагаецеся, каму аддаць перавагу, параўнайце сваё меркаванне з меркаваннем прафесіяналаў. У час адборачных матчаў Еўра-2008 сістэма футбольнай статыстыкі «Castrol Performance Index» пры дапамозе 16 відэакамер фіксавала становішча кожнага ігрока на полі і вызначала эфектыўнасць яго дзеянняў. Такім чынам, спецыялісты атрымалі дастатковы матэрыял для аналізу тэхнічнага майстэрства абаронцаў і нападаючых і склалі рэйтынг зборных — удзельнік сёлетняга турніру. Шляхам мадэлявання сустрэч турніру вучоныя разлічылі шанцы камандаў на прасоўванне прадстаўнікоў той ці іншай краіны па турнірнай табліцы і высветлілі асноўных прэтэндэнтаў на выхад у фінал: Германія — 32 % (17%), Іспанія — 24 (14 ), Нідэрланды — 18 (10), Чэхія — 20 (10), Францыя — 17 (10), Румынія — 14 (7), Італія — 12 (6), Швейцарыя — 12 (5), Партугалія — 11(5), Харватыя — 11 (5), Швецыя — 7 (3), Грэцыя — 6 (2), Турцыя — 6 (2), Польшча — 5 (2), Расія — 3 (1), Аўстрыя — 3 % (1%). У дужках пазначана верагоднасць перамогі ў фінале Еўра. Калі верыць гэтай інфармацыі, то сёлета чэмпіёнам стане зборная Германіі, якая, дарэчы, ужо тройчы (больш за іншых) станавілася найлепшай на кантыненце. Мінулы раз гэта было ў 1996 годзе.**

## Калі пойдзе салодкая ягада?

**Як мяркуецца, пачатку масавай нарыхтоўкі ад насельніцтва клубніц Лунінецкае раённае спажывецкае таварыства дасць «старт» з наступнага тыдня. Калі, безумоўна, не падвядзе надвор'е. Тады ж будуць вызначаны і канкрэтныя закупачныя цэны.**

Што да планаў, дык на сёлетні сезон вобласцю для раённага спажывецкага таварыства даведзены план па нарыхтоўцы клубніц у памеры 830 тон (летась фактычна было нарыхтавана 415,7 тоны ягад). Насамрэч у гэтым сезоне ў цэлым па раёне плануецца закупіць да 2 тысяч тон клубніц, паведаміла журналісту «Звязды» эканаміст Лунінецкага спажывецкага таварыства Аксана Сайко. Пакуль жа яшчэ нешматлікія гандляры прапануюць у горадзе ўласную прадукцыю па 3,5—3,8 тысячы рублёў за кілаграм. Напрыклад, у сталіцы ў спальных раёнах таксама нешматлікія прадаўцы гандлююць з рук клубніцамі па цэнах да 10 тысяч рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## За выраб дурману...

**Яму сорак гадоў, жыхар Гомеля. Раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за продаж наркатычных і псіхатропных рэчываў. Адседзеўшы пэўны тэрмін, ён, аднак, употайкі працягваў свой злачынны бізнэс, калі выйшаў на волю і абсталяваў у падвальным памяшканні дома «міні-лабараторыю» па вырабе дурману.**

Але мужчына не ведаў, што міліцыя не пакінула яго «без нагляду» і затрымала, як кажуць, у самы цікавы момант. А менавіта тады, калі ён у розных слоіках і кантэйнерах рабіў маніпуляцыі з 720,3 грамамі псеўдаэфедрыну і эфедрыну, 30 грамамі фосфару і іншымі хімічна-псіхатропнымі рэчывамі. «Алхімік» арыштаваны, паведамілі ў прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Добрыя людзі




### ЭЛІЯН І ХАРЧАВАННЕ

Адна з самых прыбытковых галін у маёй выдавецкай справе — зборнікі кулінарных рэцэптаў. Больш за трыста найменняў такіх кніжак я падрыхтаваў і выдаў. Даводзіцца ўважліва сачыць за тэндэнцыямі ў кухарскай справе. Мяне нават захапляе тэма харчавання. Але мяне непакоіць колькасць таўстуноў на вуліцах. Іх усё болей і болей. Апошнім часам з'явілася шмат тоўстых кітайцаў, але ім, відавочна, яшчэ далёка да таўстуноў амерыканскіх. Грамадзяне менавіта гэтых імперыяў вылучаюцца сваёю непатрэбнай тлустасцю і залішняй вагою. Напэўна, надыходзіць час, калі варта падумаць не толькі пра абмежаванні, звязаныя з алкаголем і тытунём, але і пра абмежаванні на прадукты харчавання. Прыклад такога рэгулявання апісаны сафістам Эліянам: «У спартанцаў і рымлянаў быў аднолькавы закон, які абмяжоўваў набыццё харчоў і тычыўся ён як якасці, так і колькасці прадуктаў. Тож бо спартанцы і рымляне патрабавалі, каб грамадзяне ва ўсім, а ў ежы асабліва, прытрымліваліся разумных межаў». Дактары і святары спрабуюць хоць неяк паўплываць на бязладнае харчаванне, але гэта ў іх атрымліваецца кепска, бо гіперкрамы зрабіліся больш уплывовымі ўстановамі за храмы і бальніцы, што зусім і не цешыць.

### ЮРАСЬ І КРЭСЛА

У букіністычнай краме, што на праспекце Незалежнасці, з год назад для чытачоў паставілі крэсла. Цяперака той, хто прытаміўся, можа пагартаць кнігу седзячы. Але гэта толькі гіпатэтычна ты можаш прысесці; бо тое крэсла, зазвычай, займае чарнабароды вар'ят. Так кнігарня займела свайго заўсёднага чытача. Цяперака мне нават з цяжкасцю ўяўляецца тая крама без сагнутага над тэкстам чорнагаловага шаленца. А тут раптам замест цёмнай і каротка пастрыжанай галавы я пабачыў галаву безнадзейна-белую і сівабародую. Юрася я пазнаў не адразу, а калі і прызнаў, дык не стаў перарываць ягонае захапленне старымі альбомамі па мастацтве. Разам з Юрасём я некалі займаўся ў мастацкай вучэльні. Зараз ён выглядае такім нямоглым і старым, што нават вар'ят саступіў яму сваё крэсла. Мне зрабілася так шкада Юрася і сябе, што я хутка сышоў з прапыленай букіністычнай крамы на свежае паветра.

### НАПАЛЕОН І ЛАТЫГОЛЬ

Школьны настаўнік Карпейчык праехаў на ровары па старой беларускай дарозе ад Беразіно да Маладзечна. Ён выбраў гэткі маршрут, бо ім у свой час з Масквы ў Парыж вяртаўся Напалеон. У мястэчку Латыголь ваяр спыніўся. Напалеонаўскі маршал Мюрат у мемуарах згадвае Латыголь, бо тамака сцягі найвялікшай арміі здымаліся з дрэўкаў, а дрэўкі закопваліся ў балоцістую беларускую зямлю. З якім непрыхаваным захапленнем настаўнік распавядаў пра авангард і ар'ергард напалеонаўскага войска! Я ажно заслухаўся, бо і сам быў у той Латыголі, вакол якой і дагэтуль ляжаць пракаветныя лясы, поўныя гадзюкаў. Схамянуўшыся, я падумаў, што мяне ўсё ж мала цікавяць уланы і драгуны, якія скарылі Маскву. Мне значна прыемней згадаць Латыголь з іншай нагоды, бо менавіта там я злюбіўся са сваёй першай жанчынаю, якая, між іншым, насіла французскае імя — Жана.

### АЛЕСЬ І ЛЮСТЭРКА

Ідучы ў прывакзальнай пасажыраплыні, я падумаў, што навокал шмат людзей, якім не варта глядзецца ў люстэрка. Ад такога відовішча можна моцна заперажываць. Зірнеш раніцай на ўласнае адлюстраванне, а потым цэлы дзень будзеш маркоціцца. Лепей не глядзець. Несумненна, прызвычаіцца можна да рознай выродлівасці, але змірыцца з уласным страхалюдствам найцяжэй. Таму шмат хто і пазбягае сустрэчы з люстэркам. Мой знаёмы Алесь у люстэркі амаль не глядзіцца. Ён нават галіцца навучыўся навобмацак. Голіць ён не толькі падбароддзе, але і ўсю галаву цалкам, бо валасоў на галаве засталося зусім мала. За апошні год Алесь згубіў два пярэднія зубы, але ў зубапратэзны кабінет яго не загнаць. Так і сядзіць у бары лысы і бяззубы, а калі які чалавек пачынае побач нешта фатаграфаваць, Алесь уцягвае голаў глыбока ў плечы і, прыкрываючы твар каўняром курткі, хутка сыходзіць у праспектную пасажыраплынь.

### ДЗЁМА І ПЯТЛЯ

Ён зарабіў грошы. Ён кінуў жонку. Ён пабудаваў дом. Ён сеў на крэсла ў сваім вялікім пустым доме, і слодыч жыцця перапоўніла яго так, што Дзёму захацелася зашморгнуць пятлю на ўласнай шыі. Ён патэлефанаваў знаёмаму аптымісту і сказаў: «Мне так добра, так добра, што хочацца павесіцца!» Аптыміст не зразумеў Дзёму і пачаў казаць банальнасці. Ад тых прэсных ісцін у Дзёмы прапала пачуццё паўнаты жыцця, і ён перадумаў засільвацца.

### БУСАЛАРА І КАНЬЯК

Дзень нараджэння заўсёды прыносіць сюрпрызы. Можа ў іншы дзень ты б на гэты факт і ўвагі не звярнуў, але ў святочныя дні нават звычайныя рэчы набываюць значнасць. Таму я стараюся пазбягаць святочных метамарфозаў. Мяне радуе будзёнасць, а святы прыгнятаюць. Толькі ад святаў і ўрачыстасцяў нідзе не падзецца. Куды можна падзецца з дня нараджэння жонкі, з якой пражыў дваццаць пяць гадоў? Сядзіш за сталом і ясі пасту з марскімі грабеньчыкамі, прыгатаваную венецыянцам Даніэле Бусалара. Паста смачная, але ніхто не збіраецца з'ядаць дзве порцыі. І Бусалара ў дадатак да свайго кулінарнага шэдэўра пачынае расказваць класічны венецыянскі анекдот: «У бар заходзіць зусім п'яны наведнік і пачынае патрабаваць літр віна. Барман дае толькі паўлітра. Мужчына выпівае паўлітра і просіць яшчэ столькі ж. Барман пагаджаецца даць толькі шклянку. Пасля выпітай шклянкі п'яніца ўгаворвае бармана наліць яму чарачку «на пасашок». Барман налівае і п'янтос задае сакраментальнае пытанне: «Скажы ты мне, чаму, п'ючы ўсё меней і меней, я п'янею ўсё болей і болей?» Усе смяюцца, усе радуюцца, радуюся і я, бо, распавядаючы показку, Бусалара разыграваў яе па ролях. У ролі віна быў каньяк, які наліваўся ў келіх. Бутэлька каньяку пасля показкі пра венецыянскага цікаўнага п'яніцу была пустою, і гэта мяне несказана ўзрадавала.

**Адам ГЛОБУС.**

## Дзе спякота, там пажары

**Як і прагназавалася, з надыходам спякотнага надвор'я пачасціліся пажары ў лясных угоддзях: у дзень рэгіструецца па дватры, хоць яшчэ нядаўна часам выпадала поўнае «зацішша», паведаміў дырэктар РУП «Беллесавія» МНС Аляксей Пшонка.**

Павольнае павелічэнне колькасці ўзгаранняў па сумнай традыцыі зафіксавана пасля «пікнікова-шашлычных» выхадных. Сёння ў паветры на патруляванні працуюць усе 15 «бартоў» (акрамя рэзерву) прадпрыемства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 16 (267)**

### Пасадка хвойных саджанцаў



Памятайце, што аптымальныя тэрміны пасадкі хвойных саджанцаў з адкрытай каранёвай сістэмай — ранняя вясна, сярэдзіна лета, альбо зіма. У астатні час пры перасадцы яны гінуць. Кантэйнерныя расліны высаджваюцца вясной або ўвосень. Чорны сажысты налёт на іголках, пажухлыя верхавіны некаторых галінак — прымета павольнай гібелі расліны. Такія саджанцы садзіць не варта.

Карані павінны быць свежыя, карычневыя з белымі кончыкамі. Падсохлая каранёвая сістэма не аднаўляецца і расліны гінуць. Кантэйнеры з хвойнымі раслінамі перад пасадкай пажадана змясціць у ёмістасць і вытрымаць у ёй 10—12 гадзін. Хвойныя не патрабуюць падразання пасля пасадкі. У яркія сонечныя дні іх трэба прыцяняць. Глебу вакол хвойных варта замульчыраваць буйным пілавіннем, гравіем або проста карой ад дрэў.

### Скарбонка дачнага вопыту

*Падкормка таматаў.* Пасля высадкі расады прымяняюць арганіку, напрыклад, кампост. Затым двойчы падкормліваюць нітрафоскай — 1 сталовая лыжка на вядро вады. Калі плады пачнуць налівацца, ва ўгнаеннях прытрымліваюцца суадносінаў: 1 частка азоту, 4 часткі фосфару і 8 частак калію. Для гэтага ў ліпені на кожнае вядро раствору нітрафоскі дадаюць 1 чайную лыжку калімагнезію, праводзячы 3—4 такія падкормкі.



Каб паскорыць плоданашэнне таматаў, трэба выдаляць старыя лісты, але не раней, чым праз 3—4 тыдні пасля пасадкі, калі пачнуць налівацца плады на першых кісцях. Абрываць варта не больш як 2—3 лісты з памідорнага куста ў тыдзень.

### Суседзі-расліны: сябры ці ворагі

**Добра вывучыўшы ўплыў раслін адна на другую, вы зможаце не толькі палепшыць урадлівасць глебы, але і адпуджваць шкоднікаў, прыцягваць карысных насякомых, зніжаць паражэнне раслін хваробамі.**

*Якія ж узаемаадносіны асноўных агародных раслін?*

Уздзеянне фітанцыдаў і іншых рэчываў, якія выдзяляюць лісты, кветкі і карані раслін на суседнія культуры можа быць даволі разнастайным. Напрыклад, большасць вастраводарных культур, у тым ліку кроп, пятрушка, пастарнак, кінза, сельдэрэй не любяць суседства, таму што кожная з іх выдзяляе фітанцыды, як у паветра — лістамі, так і ў глебу — каранямі, што прыгнятае такіх жа пахкіх суседзяў. А вось у суседстве з менш пахкімі аднатыпнымі раслінамі яны прыносяць найбольшую карысць: адпуджваюць шкоднікаў або стымулююць рост культур, якія растуць побач, каранёвымі выдзяленнямі.

Большасць з вас ведаюць аб карысці размяшчэння побач градак цыбулі з морквай, прычым зніжаецца небяспека пашкоджання цыбулі цыбульнай мухай, а морквы — маркоўнай мухай і тлёй. А ці ведаеце вы, што цыбулю рэпчатую карысна высаджваць побач са сталовымі буракамі, цыкорыем, наготкамі. Для агульнага абеззаражвання глебы ад хваробатворных мікраарганізмаў і адпуджвання ад радыскі крыжакветных блошак побач з ёй таксама карысна размясціць цыбулю і часнок. Вось толькі пасадкі бабовых культур і капусты не варта планаваць побач ні з цыбуляй, ні з часнаком.

Пасля цыбулі добра растуць бабовыя, зяленіўныя, капуста, таму што на гэтыя культуры дабратворна ўздзейнічаюць каранёвыя выдзяленні цыбулі, якія застаюцца ў глебе пасля яе ўборкі.

Пасадзіце побач з агуркамі кукурузу — яны будуць стымуляваць рост адно аднаго, а кукуруза паслужыць яшчэ і шырмай. Карысна побач з агуркамі пасеяць і радыску. Павялічвае працягласць плоданашэння агуркоў пасеяны сярод агурочнай градкі кроп. Побач з пятрушкай агуркі садзіць не рэкамендуецца. Суседства з ёй любяць таматы. Развіццю фітафторы ў таматаў дапамагае працістаяць яравы часнок. У якасці сідэрата перад пасадкай таматаў карысна сеяць салатную гарчыцу альбо вырошчваць радыску — гэтыя культуры добра ачышчаюць глебу ад хваробатворных арганізмаў, а выдзяленні іх каранёў спрыяльныя для паслёнавых раслін.

Гарох, фасоля, чорныя бабы выдатна ўжываюцца з бульбай, таматамі, баклажанамі, агуркамі, гарбузамі, дыняй. Любыя салаты і шпінат станоўча ўплываюць на ўсе расліны, што растуць побач. Радыска выйграе ад суседства з крэс-салатай. Гарчыца белая побач з гарохам садзейнічае адсутнасці гарохавай пладажэркі. Шпінат і маяран «сябруюць» з радыскай і салатай. А вось фенхель і ісоп прыгнечваюць усе віды агародных культур, іх лепш вырошчваць у садзе, воддаль ад агародніны.

***(Працяг тэмы ў наступным выпуску.)***



### Нітраты і прадукцыя агарода

Любая расліна змяшчае нітраты, крыніцай якіх з'яўляюцца азотныя ўгнаенні, прычым, як мінеральныя, так і арганічныя. Напрыклад, гной пры няправільным яго выкарыстанні можа атруціць глебу не горш чым «хімія» з пакеціка. Патрэбнасць розных культур ва ўгнаеннях вызначаецца ўласцівасцямі глебы, колькасцю раней уносімых угнаенняў, месцам размяшчэння ўчастка. Напрыклад, пры добрай асветленасці (працяглы светлавы дзень, сонечнае месца) нітратаў у пладах накопліваецца менш, а вось летам дажджлівым і халодным — больш.

У кожнай расліны існуюць свае «загашнікі» скаплення нітратаў: у моркве і радысцы — гэта ніжняя частка караняплода; у капусце верхнія лісты ў качане і ў храпцы; у агурках, кабачках, гарбузах — у лупінах і частцы плода каля сцябла; у бульбе і бураках — у лупінах і сарцавіне. Вядома, што салата, буракі сталовыя, радыска, шпінат — накапняльнікі нітратаў. А вось салодкі перац, часнок, баклажаны накопліваюць нітраты ў меншай ступені. Некаторыя агароднікі адмаўляюцца ад унясення мінеральных угнаенняў, выкарыстоўваючы толькі арганіку. Як можна ў такіх умовах вырасціць якасную гародніну?

Перш за ўсё вызначце патрэбнасць глебы на вашым участку ў падкормках. Калі глеба ўрадлівая, то гной рэкамендуецца ўносіць не радзей, чым раз у тры гады. Уносьце толькі добра перапрэлы гной і прычым лакальна.

Менш нітратаў накопліваецца ва ўмовах добрай асветленасці, месца для градак выбірайце сонечнае, цень і паўцень пакіньце для дэкаратыўных культур. Своечасова прарэджвайце агародныя культуры, загушчаныя пасадкі схільныя да накаплення нітратаў.

Перад пасевам замочвайце насенне ў растворы мікраэлементаў і стымулятараў росту. У далейшым гэта дапамагае раслінам лепш усвойваць, а не накопліваць нітраты.

Ураджай збірайце ў сонечныя, але не ў гарачыя дні, прычым абавязкова ў другой палове дня. У гэты час сутак колькасць нітратаў у раслінах у два разы меншая, чым раніцай. Пры гэтым збірайце толькі поўнасцю выспелую гародніну. Памятайце, што маладыя плады змяшчаюць больш нітратаў, чым добра выспелыя.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | _______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | _______ руб. | | |

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе да **2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, 7 тэлевізараў «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 ліпеня 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да **12 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі да **20 верасня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Пасля **20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў сённяшнім нумары. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 30.04.08 па 10.07.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1036 ад 25.04.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**10 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________ (аддзяленне сувязі)

____________________ **на III кв. або 2-е паўг. 2008 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ (індэкс) ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Inter-ПОЛ

### СПЕКУЛЯНТЫ ПАДАБРАЛІСЯ ДА ГУЛЬНЯЎ-2008

**Групу спекулянтаў білетамі на Алімпійскія спаборніцтвы выявілі і абясшкодзілі праваахоўныя органы Пекіна.**

Зламыснікі куплялі білеты на Алімпіяду, адкрыццё якой адбудзецца 8 жніўня, карыстаючыся падробнымі дакументамі, а пасля перапрадавалі іх па больш высокіх цэнах. У выніку расследавання пасля затрымання рабочых-мігрантаў, якія куплялі білеты на Алімпіяду па падробных дакументах, быў затрыманы і кіраўнік злачыннай групы. Ім аказаўся ўладальнік адной з пекінскіх рэкламных кампаній. Усяго ім было куплена больш за 1,5 тысячы білетаў, у тым ліку 35 — на цырымонію адкрыцця Гульняў. Для вырабу падробных пашпартоў групай злачынцаў была сабрана інфармацыя аб 2,5 тысячах людзей, а таксама адкрыта 920 банкаўскіх рахункаў для аплаты білетаў праз Інтэрнэт. Паводле слоў крымінальнікаў, яны мелі намер прадаваць білеты з 50-працэнтнай нацэнкай ад іх рэальнага кошту. Гэта першы выпадак спекуляцыі білетамі на Алімпіяду ў Пекіне.

### КРЭДЫТ НА... ЗАБОЙСТВА

**Жыхар Вялікабрытаніі дараваў сваёй жонцы тое, што яна мела намер яго забіць, каб атрымаць страхавую выплату. Прадпрымальная жанчына нават узяла крэдыт у банку, каб ажыццявіць задуманае злачынства.**

Пры вынясенні прыгавору ў лонданскім судзе Олд-Бейлі муж абвінавачанай дараваў ёй усё і паабяцаў падтрымліваць, пакуль яна будзе ў турме. За арганізацыю забойства 44-гадовая маці шасцярых дзяцей Зоі Кенілі прыгаворана да сямі гадоў пазбаўлення волі. Суддзя ахарактарызаваў злачынства як «цынічную і жорсткую спробу забойства мужа».

Як вынікае з матэрыялаў справы, сацыяльны работнік Зоі Кенілі хацела назаўсёды пазбавіцца ад свайго мужа, каб атрымаць пасля яго смерці 33 тысячы фунтаў стэрлінгаў страхоўкі (прыкладна 66 тысяч долараў ЗША). Кенілі, якая жыве ў горадзе Кенілі (графства Сурэй), дала свайму суседу, 31-гадоваму Лі Вэйту, 3 тысячы фунтаў стэрлінгаў, каб той наняў кілера. Аднак пасрэднік паклаў грошы ў сваю кішэню.

### ПРЫСЯЖНЫХ ЗАСПЕЛІ ЗА КРАСВОРДАМ

**Беспрэцэдэнтны выпадак адбыўся ў адным з акружных судоў Аўстраліі. Суддзя вымушаны быў спыніць слуханні справы па захоўванні вялікай партыі наркотыкаў, калі ўбачыў, што прысяжныя заняты... разгадваннем японскіх красвордаў.**

Пра тое, што прысяжныя займаюцца зусім не тым, чым патрэбна, суддзі акружнога суда Сіднэя сказаў адзін з абвінавачаных. Ён убачыў, што адна з прысяжных робіць запісы не гарызантальна, а вертыкальна. Аказалася, што ўвесь гэты час апошняя разгадвала японскі красворд «судоку». Паводле яе слоў, такі занятак дапамагаў ёй лепш сканцэнтравацца на працэсе слухання.

Пакуль прысяжныя запаўнялі клеткі красворда, у судзе ішло слуханне, да якога былі прыцягнуты каля сотні сведкаў. Абвінавачаныя ў захоўванні наркотыкаў могуць атрымаць пажыццёвае заключэнне. З-за інцыдэнту, які адбыўся, працэс будзе ўзноўлены толькі праз некалькі тыдняў.

### А ГРОШЫ ЗАКАПАЎ...

**У Сербіі затрыманы банкаўскі служачы, які выкраў на працы 1,5 млн еўра. Клерк закапаў грошы ў парку, пасля чаго патэлефанаваў у паліцыю і папрасіў яго арыштаваць.**

Супрацоўнік аднаго з банкаў Аляксандр Спэйсік дачакаўся моманту і з выкрадзеным мяшком грошай накіраваўся ў парк, дзе іх і закапаў. Між іншым, Спэйсік ужо знаходзіўся «пад каўпаком» паліцыі. Справа ў тым, што клерк сам паведаміў пра тое, што выкраў грошы: «Мне шкада, але я павінен гэта зрабіць», — было сказана ў запісцы, якую Спэйсік пакінуў на стале свайго непасрэднага начальніка, калі са здабычай пакідаў офіс. Спачатку паліцэйскія знайшлі грошы, а пасля затрымалі і служачага. Праўда, зрабіць апошняе не складала цяжкасцяў: Аляксандр зайшоў у кавярню побач з паркам, патэлефанаваў у паліцыю і запытаўся ў афіцэраў, маўляў, колькі іх яшчэ чакаць. Матывы свайго ўчынку ён так і не змог патлумачыць.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

## ПАНЯДЗЕЛАК, 16 ЧЭРВЕНЯ

5.25 «Вялікія кампазітары». Моцарт. Людвіг Ван Бетховен.
6.20, 7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.45, 7.45, 18.50, 0.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.25 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05 Фігуры.
9.35 Здароўе.
10.00 «Жыццё як жыццё». Ранні шлюб.
11.05, 17.30 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.10 Меладрама «Курортны раман».
13.55 Дак. серыял «Выкраданне Еўропы».
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 Час кіно.
16.30 Серыял «Родныя людзі».
19.30 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
20.00 «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.45, 0.55 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3».
22.45 Трылер «Непаражальны».
0.45 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00. 20.30, 23.40, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10, 11.10 Камедыя «Формула кахання».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.55, 3.20 Навіны спорту.
12.00 Малахаў+.
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.05 «Кантрольная закупка».
14.40 «Людзі ў чорным».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы 2008. Зборная Аўстрыі — зборная Германіі.
0.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы 2008. Зборная Польшчы — зборная Харватыі.
1.55 Спецрасследаванне. «Атручаныя канікулы».
*3.30—5.00 Прафілактыка.*
5.05 «Кіно на дваіх».

6.40, 14.25 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 16.05 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.35 Невытлумачальна, але факт.
9.25 У гэты дзень.
9.30. 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.20 «Святло далёкай зоркі». Віктар Помазаў.
10.45, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.45 Добрыя навіны.
12.15 Усё аб бяспецы.
12.45 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
13.15 Школа рамонту.
14.10 Тэлебарометр.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Нянька спяшаецца на дапамогу.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Астролаг».
19.55 Калыханка.
20.15 Беларуская часінка.
21.20 Серыял «Лабірынты розуму».
22.30 Баскетбол. НБА. Фінал.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40 «Вялікае снеданне».
8.15 «Горад дзяцінства».
8.30, 16.50 Серыял «Афрамасквіч-2».
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Наш дом».
11.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.10 «Жыццё працягваецца». Серыял.
12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».
12.50 «Наша справа».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Народжаныя ў СССР».
14.30 «Культурнае жыццё».
15.00 «Гаргуллі». Мультсерыял.
15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 Маст. фільм «Сястрычка».
23.10 Серыял «Уцёкі».
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Сталічны футбол».
0.40 «Гучная справа».
1.30 «Уваскрэсенне класікі».
2.25 Драма «Супраціўленне».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 1.10 Садружнасць live.
5.30 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
6.20 «Удачная пакупка».
6.40 «Цік-так».
7.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.35 Дак. серыял «Тайны і падарожжы».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Жадаю Вам...».
10.30 Маст. фільм «Снежная каралева».
12.05, 23.30 Маст. фільм «Паэма двух сэрцаў».
14.05 Мультсерыял «Кліфард».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20, 23.25 «Студыя 60х90».
15.25 Дак. серыял «Дзіўнае жытло».
16.05 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Прыгоды мага».
19.30 «Агульны інтарэс».
20.05 «Спрэчная тэрыторыя».
21.20 Серыял «Агенцтва НЛС».
22.30 «Кома».

7.00, 10.50, 16.55, 19.30 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 21.05, 23.25 «Метэапрагноз».
7.30 Маст. фільм «Утаймавальніца тыграў».
8.55 «К-гульні».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Дак. фільм «У пошуках ягуара».
11.00 Маст. фільм «Моцны арэшак».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
17.00 «Падарожжа з густам».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
19.40 Серыял «Брыгада».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Трылер «Вораг мой».
23.00 Серыял «Падарожнік».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 «Эфір як прадчуванне».
10.00 «Відавочнае-неверагоднае».
10.30 «Сумленны дэтэктыў».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 «Кнот».
12.55 Серыял «Зацьменне».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Рамэо і Джульета».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.50 Серыял «Сямейныя тайны».
21.00 Серыял «Крот-2».
22.05 «Гарадок».
23.10 «Начныя матылькі. Горкія ісціны».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!».
10.00, 17.30, 1.30 Серыял «Гонка за шчасцем».
10.45, 20.30, 3.45 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 Пакой смеху.
12.10, 21.15, 4.30 Серыял «Чырвоная капэла».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Смерць Арфея».
15.05 Навіны культуры.
15.30, 6.15 «Пра арт».
16.30 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 2.15 Серыял «Дарослыя гульні».
18.15 «Хто Вы, містэр Рыд?».
19.45 «Уладзімір Ленін. Анатомія легенды». Фільм 1-ы.
22.00, 5.30 «Гарадок».
22.50 Весткі—Санкт-Пецярбург.
23.05 «Паэзія і час». Андрэй Вазнясенскі.
23.50, 5.15 «Весткі+».
0.05 «Начны палёт».
0.35 «Юродзівыя».
1.20, 6.45 Весткі-спорт.

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00 «Агляд».
9.25 «Злачынства ў стылі мадэрн».
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.30 Серыял «Адвакат».
15.10 «Прафесія — рэпарцёр».
15.30, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.45 Серыял «Бухта страху».
20.50 Серыял «Цені мінулага».
22.30 Серыял «Свой-чужы».
23.40 Серыял «Стаўка на жыццё».

*5.00—13.00 Прафілактыка.*
13.00 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Гагарынскія галаварэзы».
13.30, 16.30, 18.50, 19.30 Падзеі.
13.45, 0.20 Пятроўка, 38.
13.55, 15.30 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
14.30 «У цэнтры падзей» з Ганнай Прохаравай.
15.35 «Дакументальны дэтэктыў». «Паляўнічыя за нацыстамі».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 «Запрашае Барыс Ноткін». Аляксей Ціханаў.
17.45, 20.00, 0.40, 2.05, 3.30 Маст. фільм.
18.55 «Зорныя пёры». Спецрэпартаж.
22.10 Момант ісціны.
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.35 «Нічога асабістага». Эўтаназія.

9.30 Мотаспорт па выхадных.
10.00, 14.30, 0.00 Футбол. Еўра-2008. Часопіс.
10.30, 17.00 Футбол. Еўра-2008. Харватыя—Германія.
12.30 Футбол. Аўстрыя—Польшча.
15.00 Аўтаспорт.
16.00 Тэніс. Турнір ATP. Фінал.
19.00, 21.00 Футбол. Еўра-2008. Навіны.
19.15 Лёгкая атлетыка.
21.15 Байцоўскі клуб.
0.30 Футбол. Турцыя—Чэхія.

### 22.45 ФІЛЬМ ДНЯ

**«НЕПАРАЖАЛЬНЫ» (ЗША, 2000 г.)**

За ўсё жыццё ён нічым не хварэў і заўсёды быў адзіным, хто выжываў у страшных катастрофах. Спрабуючы разабрацца са сваім дарам, ён знаёміцца з дзіўным чалавекам, празваным містэр Шкло, у якога рэдкая хвароба, пры якой яго косткі надзвычай ломкія.

**Рэжысёр** — М. Найт Ш'ямалан. **У ролях:** Брус Уіліс, Сэмюэль Л. Джэксан, Робін Райт Пен, Спенсер Трыт Кларк, Шарлайан Вудард.



## АЎТОРАК, 17 ЧЭРВЕНЯ

5.25, 15.55 Серыял «Тайны следства-2».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05, 9.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 1.00 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 Дак. фільм «Нябачны фронт»
9.10, 19.55 Серыял «Працяг будзе».
10.05, 16.55 Серыял «Родныя людзі».
10.55, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Меладрама «Дзеці Дон Кіхота».
13.35 Дак. серыял «Выкраданне Еўропы».
14.05 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.15 Серыял «Вось так!».
19.35 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45, 1.45 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3».
22.45 Баявік «На грэбені хвалі».
1.05 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.40, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
10.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.55, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.05 «Кантрольная закупка».
14.40 «Людзі ў чорным».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
18.55 Серыял «Таццянін дзень».
20.00 Час.
21.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы-2008. Зборная Францыі — зборная Італіі.
0.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы-2008. Зборная Галандыі — зборная Румыніі.
1.55 «Асноўны інстынкт».
3.25 Серыял «Сабачая справа».
4.15 Серыял «Маё жыццё і я».
5.05 Спецрасследаванне. «Атручаныя канікулы».

6.45, 14.00 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 16.05 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.40, 18.50 Серыял «Астролаг».
9.30 У гэты дзень.
9.35, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.20 «Лабірынты: каменная абсерваторыя».
10.50, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.45, 22.30 Серыял «Лабірынты розуму».
12.45 Школа рамонту.
13.40 ПРАсоўванне+.
14.30 Мультфільм «Мільён у мяшку».
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.10 Невытлумачальна, але факт.
18.35 Навіны культуры.
19.55 Калыханка.
20.15 Беларуская часінка.
21.20 Спорт-кадр.
21.55 «Іншыя». «Звёны аднаго ланцуга».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 Серыял «Афрамасквіч 2».
9.00 «Прачніся і спявай».
9.30 «Лінія лёсу».
10.00 «Сталічны футбол».
10.40 Анфас.
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 Серыял «Жыццё працягваецца».
12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Сталкер».
13.50 «Чэмпіянат свету па ралі». Грэцыя.
14.40 Серыял «Студэнты 2».
15.40 «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Аўтапанарама».
20.50 Серыял «Салдаты 14».
22.00 «Рэпарцёр СТБ».
23.10 Серыял «Уцёкі».
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Зоркі спорту».
0.40 «Надзвычайныя гісторыі».
1.30 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
12.05, 23.30 Маст. фільм «Кухар і спявачка».
14.05 Мультсерыял «Кліфард».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20, 23.25 «Студыя 60х90».
15.25 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
16.05 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Прыгоды мага».
19.35 «Каму на Русі жыць добра...».
20.05 «Спрэчная тэрыторыя».
21.20 Серыял «Агенцтва НЛС».
22.30 «Кома».
1.10, 2.35 Садружнасць live.
1.35 Дак. серыял «Самае-самае».

7.00 «К-гульні».
7.10, 10.55, 23.20 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Каралева».
8.50, 19.00, 19.30, 23.15 «Навіны кіно».
9.00 «Клуб 700».
9.30, 16.30 «Мультпарад».
9.45 Дак. фільм «Уладар палярных прастораў».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Вораг мой».
13.00 «Дзённы тэлечат».
17.00 «Падарожжа з густам».
17.30 Маст. фільм Марыо Бава «Кроў і чорная стужка».
19.15 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
19.40 Серыял «Брыгада».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Маст. фільм «Сем гадоў у Тыбеце».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.00 «Лётчык для Молатава».
9.50 Серыял «Сямейныя тайны».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.25 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45, 21.00 Серыял «Крот-2».
12.45 «У Гарадку».
12.55 Серыял «Зацьменне».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.50 Серыял «Сямейныя тайны».
22.05 Серыял «Вайна ў доме-2».
23.10 Весткі+.
23.30 «Кінескоп» з Пятром Шапаціннікам». «Канскі кінафестываль».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!».
10.00, 17.30, 1.30 Серыял «Гонка за шчасцем».
10.45, 20.30, 3.45 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 «Паэзія і час». Андрэй Вазнясенскі.
12.10, 21.15, 4.30 Серыял «Чырвоная капэла».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Дым».
14.45 Мультфільмы.
15.05 Навіны культуры.
15.30, 6.15 «Легенды сусветнага кіно». Вольга Жызнева.
16.30 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 2.15 Серыял «Дарослыя гульні».
18.15 «Савецкая імперыя. Народны аўтамабіль».
19.45 «Уладзімір Ленін. Анатомія легенды».
22.00, 5.30 «Ланцуговая рэакцыя».
22.50 Весткі—Санкт-Пецярбург.
23.05 «Апокрыф».
23.50, 5.15 Весткі+.
0.05 «Начны палёт».
0.35 «Павуціна. Гандлёвая мафія».
1.20, 6.45 Весткі-спорт.

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00, 19.45 Серыял «Бухта страху».
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Quattroruote».
11.20 Серыял «Паляванне на генія».
13.30 Баявік «Марскія д'яблы».
15.10 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
15.30, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
20.50 Серыял «Цені мінулага».
22.30 Серыял «Свой-чужы».
23.40 Серыял «Стаўка на жыццё».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.50 Падзеі.
7.45, 10.15, 13.45, 2.35 Пятроўка, 38.
7.55, 13.55, 15.30 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.00 Дэтэктыў «Прапажа сведкі».
9.45, 10.45, 14.30, 17.45, 20.05, 0.45 Маст. фільм.
12.45 Момант ісціны.
15.35 «Дакументальны дэтэктыў». «Паляўнічыя за нацыстамі».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 «21 кабінет».
18.55 Тварам да горада.
22.15 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Пачым уступныя экзамены?».
23.10 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.40 Аўтагонкі.
4.45 Мультфільм.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00, 14.30, 0.00 Футбол. Еўра-2008. Часопіс.
10.30 Футбол. Еўра-2008. Нідэрланды — Францыя.
12.30, 17.00 Футбол. Італія — Румынія.
15.00, 19.15 Футбол. Нідэрланды — Францыя.
19.00, 21.00 Футбол. Еўра-2008. Навіны.
21.15 Аўтаспорт.
21.45 Бокс.
0.30 Футбол. Польшча — Харватыя.

### 21.00 ФІЛЬМ ДНЯ

**«СЕМ ГАДОЎ У ТЫБЕЦЕ» (ЗША, 1997 г.)**

У яго было ўсё — поспех, прыгажосць, вядомасць. Але яму было мала зямной славы і ён адпраўляецца на пакарэнне самага непрыступнага піка ў Гімалаях. Ён дабіраецца да тыбецкага горада, дзе яму давядзецца пражыць доўгіх сем гадоў і дзе малады Далай Лама робіць яго сваім прыбліжаным.

**Рэжысёр** — Жан-Жак Ано. **У ролях:** Брэд Піт, Дэвід Т'юліс, Б.Д. Вонг, Мако, Дэні Дэнзонгпа, Віктар Вонг, Інгеборга Дапкунайтэ, Лакпа Тсамшо.



## СЕРАДА, 18 ЧЭРВЕНЯ

5.25, 15.50 Серыял «Тайны следства-2».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 0.50 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
*9.05—15.00 Прафілактыка.*
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.05 Серыял «Вось так!».
16.55 Серыял «Родныя людзі».
17.50 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
19.35 Зямельнае пытанне.
19.55 Серыял «Працяг будзе».
21.00 Панарама.
21.45, 1.35 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3».
22.45 Меладрама «Прыродзе насуперак».
0.55 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.40, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.55, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.05 «Кантрольная закупка».
14.40 «Людзі ў чорным».
15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.10, 5.05 «Няхай гавораць».
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
20.00 Час.
21.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы 2008. Зборная Расіі — зборная Швецыі.
0.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы 2008. Зборная Грэцыі — зборная Іспаніі.
1.55 Тэорыя неверагоднасці. «Рэўнасць».
3.25 Серыял «Сабачая справа».
4.15 «Маё жыццё і я». Серыял.

6.40, 14.15 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 16.05 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.40 Серыял «Астролаг». Заключная серыя.
9.30 У гэты дзень.
9.35, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.20, 17.25 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.20, 22.30 Серыял «Лабірынты розуму».
12.20 Спорт-кадр.
12.50 «Тэатр. Выбранае». X Міжнародны фестываль рускіх тэатраў краін СНД і Балтыі (г. Санкт-Пецярбург).
13.30 «Праект «Тэра». Дак. фільм.
14.45 «Вяртанне блуднага папугая». Мультфільм.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Невытлумачальна, але факт.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Граніца. Таежны раман». 1-я серыя.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Нянька спяшаецца на дапамогу.
23.40 Футбол. МТЗ-РІПА (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
1.30 Баскетбол. НБА. Фінал.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Афрамасквіч 2». Серыял.
9.00, 20.50 «Салдаты 14». Серыял.
10.00 «Зоркі спорту».
10.40 «Аўтапанарама».
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 «Жыццё працягваецца». Серыял.
12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
